

# «ПАТРЭБНА ЭФЕКТЫЎНАЯ СІСТЭМА АБСЛУГОЎВАННЯ Ў МАШТАБАХ КРАІНЫ»

**Жорсткая размова ў Палацы Незалежнасці — не толькі аб гандлі**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЖНІЎНЯ 2025 г. СЕРАДА № 164 (30552)



Дзеля таго каб годна прыняць дзяцей 1 верасня, рыхтуюць не толькі школьныя тэрыторыі і класы, спартыўныя і актавыя залы. Не менш напружаны перадвучэбны перыяд і ў работнікаў харчблока: ім на працягу дзевяці месяцаў трэба будзе карміць практычна дзясятую частку насельніцтва краіны. Падкрэслім, найважнейшую яе частку — дзяцей. Таму напярэдадні навучальнага года былі праведзены ўсе неабходныя работы — ад рамонту да набыцця посуду і іншых рэчаў кухоннага інтэр'ера. І накіравана на гэта ўсё было больш чым 21 мільён рублёў.

СТАР. 13

# КАБ І СМАЧНА, І КАРЫСНА

**У новым навучальным годзе больш чым у 2600 школах будзе арганізавана харчаванне для 1,5 мільёна школьнікаў**



РЭКОРДЫ ТУРЫСТЫЧНАЙ ГАЛІНЫ 14



У ФАРМАЦЕ ДЫЯЛОГА

## СТРАТЭГІЯ НАШАЙ БУДУЧЫНІ

**Рэспубліканская інфармацыйна-асветніцкая акцыя «Беларусь адзіная» стартавала ў Барысаве**

Мерапрыемствы маштабнага патрыятычнага праекта, прымеркаванага да Дня народнага адзінства, таксама пройдуць у Гродне, Жлобіне, Мінску, Магілёве, Віцебску і Кобрыне. Тэматыка сёлетняй рэспубліканскай інфармацыйна-асветніцкай акцыі, якая, пачынаючы з 2021 года, традыцыйна праходзіць напярэдадні 17 верасня, — «Беларусь — стратэгія будучыні».



СТАР. 4

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

25164>

9 771990 763008

# «ПАТРЭБНА ЭФЕКТЫЎНАЯ СІСТЭМА

## Жорсткая размова ў Палацы Незалежнасці —



Фота БелТА.

«Мы павінны прыняць усе рашэнні для таго, каб забяспечыць нармальнае жыццё нашых людзей, і перш за ўсё на вёсцы», — з такім пасылам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка пачаў нараду па пытаннях эфектыўнасці сістэмы гандлёвага абслугоўвання. Кіраўнік дзяржавы часта нагадвае, што без вёскі не будзе краіны. Таму людзі на вёсцы павінны жыць камфортна і мець у доступе ўсе неабходныя тавары і прадукты. За дзве з паловай гадзіны, а менавіта столькі працягвалася нарада, абмеркавалі не толькі гандлёвыя пытанні, а паглядзелі шырэй — на забеспячэнне камфортнага жыцця на вёсцы.

### «ПАДЗЕЯ, ЯКАЯ СПАРАДЖАЕ МАСУ ПРАБЛЕМ»

***Перш за ўсё кіраўнік дзяржавы патлумачыў, чаму тэма нарады найважнейшая.***

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што цяпер дамы ў сельскай мясцовасці пад дачы або для пастаяннага пражывання ўсё часцей сталі купляць гараджане і, што асабліва каштоўна, маладыя сем'і. «Дай бог, каб гэта было так, што гараджане пачалі купляць дамы ў сельскай мясцовасці. Пра што я беларусаў прасіў, заклікаў іх рабіць гэта цяпер, бо купяць іншыя, — адзначыў Прэзідэнт. — Зразумела, што для жыхароў такіх вёсак закрыццё стацыянарнай крамы — гэта падзея, якая спараджае масу праблем. І натуральна, што ў XXI стагоддзі страта магчымасці купіць самае неабходнае выклікае заканамерныя прэтэнзіі».

Закрыццё крамы ў вёсцы беларускі лідар назваў вялікай праблемай для тых людзей, якія там пражываюць. «Для чалавека ўсё роўна, чый аб'ект зачыніўся — прыватнага прадпрымальніка, камунальнай уласнасці або сістэмы спажыўкааперацыі», — заявіў Прэзідэнт. Таму ўраду і аблвыканкамам была пастаўлена задача — патрэбна эфектыўная сістэма абслугоўвання ў маштабах краіны, якая павінна стаць гарантам якасці і сацыяльнай адказнасці гандлю перад людзьмі.

«Зыходзячы з прадстаўленага мне даклада ўрада, высновы такія, як звычайна: усё па плане, насельніцтва абслугоўваецца на належным узроўні, але стрымліваюць развіццё гандлю нейкія рэгулятарныя бар'еры, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Хочацца спытаць, вы самі разумееце, што пішаце? Гэта, па-вашаму, галоўныя перашкоды для працы сельскіх крам? Кіраваць не можам, рэгуляваць працэс не можам. Я б хацеў ведаць, хто вам ўсталёўвае гэтыя бар'еры рэгулятарыкі, акрамя вас саміх, і чаму яны яшчэ не ліквідаваныя? Па вашых жа даных, рэалізуецца некалькі краінавых канцэпцый, стратэгій і планаў для сельскіх жыхароў. Дык чаму такія праблемы і незадаволенасць насельніцтва?»

З апошніх прыкладаў непрадуманых рашэнняў Аляксандр Лукашэнка назваў атрыманне электронных лічбавых подпісаў і маркіроўку тавараў спецыяльнымі пазнакамі і знакамі, якія, паводле яго слоў, для невялікага магазінчыка ў тры паліцы — цэлы квэст.

> **«Наогул, у любой справе можна дайсці да абсурду, увайшоўшы ў адміністрацыйны запал. Даніна модзе — бесталковая лічбавізацыя, напрыклад, уліку і продажу малочных прадуктаў, выклікала абурэнне як пакупнікоў, так і прадаўцоў (аж да звальнення) ва ўсіх рэгіёнах», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. Паводле яго слоў, ураду трэба яшчэ раз вярнуцца да гэтага пытання і ў самыя кароткія тэрміны ўсё разумна спрацісць. А калі трэба — зрабіць для вёскі асаблівы парадак.**

Прэзідэнт заўважыў, што людзям на вёсцы не трэба шмат — «малако, мяса, кавалак хлеба», а не лічбавізацыя.

### АДКАЗНАСЦЬ ЗА АБСЛУГОЎВАННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА ЛЯЖЫЦЬ НА МЯСЦОВЫХ ОРГАНАХ УЛАДЫ

***Прэзідэнт выдзеліў яшчэ адну прэтэнзію ў насельніцтва — аптымізацыю маршрутаў аўталавак.***

«Людзі скардзяцца на нязручны графік працы аўтамагазінаў і бедны асартымент. Мясцовыя ўлады не ў стане гэта ўрэгуляваць? Ці ў вас зноў бар'еры ў рэгулятарыцы?» — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Нароўні з нерытмічным арганізацыяй стацыянарнага і раз'язнога гандлю ёсць яшчэ адзін адчувальны для спажыўца аспект — наяўнасць тавараў са скончанымі тэрмінамі прыдатнасці. «Няма тавару — дрэнна, але пратэрмінаўка — гэта чырвоная лінія! — абурыўся Прэзідэнт. — Гэтага быць не павінна! Фактаў дастаткова. Адказнасць за абслугоўванне насельніцтва ляжыць на мясцовых органах улады. Вы як ніхто ведаеце, што адбываецца ў рэгіёнах, і абавязаныя арганізаваць гандаль у раёнах так, каб не было ніякіх нараканняў. Слухайце, гэта заўсёды было задачай райкама партыі і райвыканкамаў».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў цэлым схема павінна быць простая, і расказаў, як яна павінна дзейнічаць на практыцы: «У раённым цэнтры працуюць некалькі добрых, максімальна напоўненых таварамі гандлёвых цэнтраў, у аграгарадках — магазіны паменш. У вялікіх вёсках, якія засталіся ад цэнтраў калгасаў, якія аб'яднаны былі, неабходна навесці парадак і арганізаваць работу звычайнай крамкі, пабудаваць, адрамантаваць, забяспечыць кадрамі і таварамі нармальнай якасці. І крайняе звяно — зручныя для людзей развазны гандаль або дастаўка (каапсаюз, пошта ці прыватнік)».

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што ў невялікія вёскі, нават неперспектыўныя, варта прыцягнуць гандлёвыя сеткі для абслугоўвання насельніцтва.

> **«Трэба забяспечыць баланс: будуеш прыбытковы бізнес у сталіцы і іншых буйных гарадах — вазьмі на сябе сацыяльную адказнасць па абслугоўванні спажыўца на вёсцы. Тым больш што праблемных раёнаў не так ужо і шмат. Я хачу, каб вы гэта пачулі: у нас усе разумныя гандляры рынуліся ў буйныя гарады, пабудавалі тут крамы. Нядрэнна жывуць, праўда, на Лазурным беразе ўсе гаспадары і ўласнікі. Ну дык арганізуйце так, каб яны працавалі там, у глыбінцы, —**

# АБСЛУГОЎВАННЯ Ў МАШТАБАХ КРАІНЫ»

## не толькі аб гандлі

**паставіў задачу Прэзідэнт. — Інструменты ёсць. Нядаўна ў васьмі раёнах для буйнога сеткавага гандлю мы пашырылі магчымасць ахопу спажыўцоў.**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пры прызначэнні міністра гандлю на пасаду даручаў дабрацца да кожнага аддаленага кутка краіны і навесці там парадак. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў міністра Артура Карповіча, як выбудавана сістэма гандлёвага абслугоўвання насельніцтва ў сельскай мясцовасці ўсіх формаў уласнасці? Што рэальна, а не ў планах, зроблена?

«Прапануйце любыя дзейсныя меры ў раёнах», — запатрабаваў Прэзідэнт. Ён спытаў: як задавальняецца пакупніцкі попыт? «Зразумела, што ў сельскай краме няма сталічнай разнастайнасці. Як вырашаем гэту праблему? Якія меры прымаюцца, каб прыцягнуць прадаўцоў у сельскія крамы і мінімізаваць страты гандлёвых арганізацый? І якая цана вырашэння пытання для дзяржавы?» — пазначыў яшчэ шэраг пытанняў беларускі лідар.

### «ТАКІМІ ТЭМПАМІ ВЫ СТРАЦІЦЕ ЎСЮ ГАНДЛЁВУЮ СЕТКУ»

***Асобна кіраўнік дзяржавы пацікавіўся работай Белкаапсаюза.***

«Кааперацыі неаднаразова выдзялялася дзяржаўная падтрымка. Толькі на паліва для аўтакрам сёлета выдзелены адзін мільён трыста тысяч рублёў. Калі вы і далей плануеце так арганізоўваць гандаль Белкаапсаюза, гэта вам будзе сур'ёзны мінус. Мы што, паліва павінны для гандлю закупляць? Гэткіх цудаў яшчэ не было, — іранічна заўважыў Прэзідэнт. — Мы яшчэ летась дамовіліся, што губернатары са сваіх бюджэтаў змогуць вам дапамагчы з рамонтамі крам. Гэта што, не падтрымка?»

Аднак колькасць гандлёвых аб'ектаў на вёсцы ўсё роўна скарачаецца. Аляксандр Лукашэнка прывёў лічбы: год таму іх доля ў агульным аб'ёме складала амаль 25 %, а сёння — ужо каля дваццаці трох.

«Такімі тэмпамі вы страціце ўсю сваю гандлёвую сетку, у якой пакуль яшчэ можаце збываць прадукцыю, што вырабляецца вамі, — перасцярог Аляксандр Лукашэнка. — Як мне дакладваюць, становіцца зрухаў у фінансавых патоках ад гандлёвай дзейнасці няма (страты — 33 мільёны рублёў). Але пра сябе яны не забыліся. Заробак, дапусцім, у кіраўніцтва Белкаапсаюза вышэйшы, чым у большасці міністраў (у паўтара раза большы, чым у міністраў жыллёвай гаспадаркі і эканомікі, у 1,2 раза — чым у міністра прамысловасці)». А колькасць магазінаў на вёсцы скарачаецца, як звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, па прычыне ў тым ліку і невысокай (часам мізэрнай) зарплаты прадаўцоў.

### ТРЭБА З РОЗУМАМ ПАДЫХОДЗІЦЬ ДА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЖЫЦЦЯ ЛЮДЗЕЙ НА ВЁСЦЫ

Паводле слоў Прэзідэнта, агучаныя пытанні — гэта толькі малая частка маштабных праблем на вёсцы. «У СМІ, сацыяльных сетках, на форумах людзі сістэматычна падымаюць пытанні закрытых ФАПаў, дзіцячых садкоў, паштовых аддзяленняў, банкаў і таму падобнага», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што трэба да ўсяго падыходзіць з розумам і, вырашаючы пытанне аптымізацыі сацыяльных устаноў, глядзець не на стандарты, а глыбей — на значнасць гэтага аб'екта для людзей. Напрыклад, у асобных выпадках замест таго, каб захоўваць школу, дзе 3-4 чалавекі вучацца ў адным класе, мэтазгодней арганізаваць падвоз дзяцей у суседнюю школу, дзе яны могуць атрымліваць нармальную адукацыю.

У прыклад таго, што да кожнага выпадку трэба ставіцца індывідуальна, Прэзідэнт прывёў свежы выпадак з аграгарадка Гаршчэўшчына Талачынскага раёна Віцебскай вобласці, з якім даручаў разабрацца адказным службовым асобам. У аграгарадку быў зачынены дзіцячы садок, які наведвала мала дзяцей, але гэта дзеці работнікаў мясцовага сельгаспрадпрыемства, важных спецыялістаў, патрэбных гаспадарцы. «Я быў кіраўніком — быў зацікаўлены ў тым, каб у дзіцячы садок хадзілі дзеці, таму што вызваляюцца ў дадзеным выпадку сем пар рабочых рук», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. Як альтэрнатыву людзям прапанавалі падвозіць малых у дзіцячы садок за 7-10 кіламетраў.

**«Трох–чатырохгадовых дзетак даярка павязе за 7-10 км у дзіцячы садок? Вы там звар'яцелі? — абурыўся Прэзідэнт. — Вы гэтага не бачыце? Адпраўце свайго ўнука або дзіцятка чатырохгадовае ў гэты дзіцячы садок за трыдзевяць зямель!»**

У выніку праблема была вырашана, дзіцячая ўстанова ў гэтай мясцовасці засталася, і бацькі працягваюць працаваць на сваіх месцах са спакойнай душой за тое, што іх дзеці пад наглядам.

Але гэта толькі адзін падобны выпадак, які трапіў у поле зроку Прэзідэнта. А колькі падобных прыкладаў па краіне? Кіраўнік дзяржавы настойліва запатрабаваў з розумам вырашаць усе праблемныя пытанні па забеспячэнні жыцця людзей на вёсцы:

**«А то мы разумныя: калі трэба хлеб убіраць, тады мы бачым гэтых калгаснікаў, а больш-менш прыстойныя ўмовы не можам стварыць. Ды калі б мы не маглі!»**

Што датычыцца дапамогі таму ж Белкаапсаюзу, ды і іншым галінам і арганізацыям, кіраўнік дзяржавы запатрабаваў рэальнай аддачы, а не проста даваць ім грошы. «Яшчэ адзін «падарунак» у мяне сёння раніцай на стале — 10 мільёнаў выдзеліць сельскай гаспадарцы на закупкі рэгулятараў росту для рапсу. Што значыць выдзеліць? У крэдыт — ўсь 10 мільёнаў, заўтра павінен вярнуць, калі рапс атрымаеш. Не можаш грашыма, давай натуральную прадукцыю, мы ў цябе возьмем», — заявіў кіраўнік дзяржавы. І паўтарыў: раскідвацца бюджэтнымі грашыма проста так нельга, іх ёсць на што выдзяляць.

### НАРМАЛЬНЫЯ КРАМЫ ЛЮДЗЯМ ПАТРЭБНЫЯ ЎЖО СЁННЯ

Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур Карповіч далажыў, што па выніках работы за першае паўгоддзе гандаль займае другое месца ў ВУП — 9,6 %. Паказчык росту рознічнага тавараабароту выконваецца: пры мэтавым значэнні 104,5 % ён склаў 108,6 %. На 1 студзеня 2025 года ў краіне функцыянавала амаль 86 тысяч рознічных аб'ектаў, іх штогадовая колькасць павялічваецца ў сярэднім на 1,5 %. «У вёсках павялічваецца ў нас колькасць гандлёвых пунктаў?» — удакладніў Прэзідэнт, робячы акцэнт менавіта на сельскай мясцовасці.

Артур Карповіч адказаў, што іх колькасць у вёсках застаецца амаль нязменнай, за апошнія 5 гадоў зменшылася на 1,5 %. Пры гэтым адбываецца замяшчэнне на электронны гандаль, які актыўна развіваецца ў краіне. Аляксандр Лукашэнка адрэагаваў на гэта скептычна: «Дык вы мяне дэзынфармуеце наконт цяжкага становішча з магазінамі на вёсцы?»

Міністр удакладніў, што электронны гандаль актыўна развіваецца не толькі ў горадзе, але і на вёсцы. У сельскай мясцовасці адкрываюцца пункты выдачы, выкарыстоўваецца актыўна «Белпошта», Белкаапсаюз, Wildberries і Ozon, іншыя інтэрнэт-крамы. «Ну так, «баба Дуня» сядзіць і тыкае ў айфон...» — вобразна заўважыў на гэта Прэзідэнт. Ён заклікаў улічваць і інтарэсы людзей больш сталейшага ўзросту, для якіх электронны гандаль нязвыклы, карыстацца ім яны не ўмеюць.

Старшыня Нацыянальнага статыстычнага камітэта Іна Мядзведзева ўдакладніла сітуацыю лічбамі. Так, штогод колькасць крам у сельскай мясцовасці скарачаецца на 100–250 адзінак. У цэлым доля рознічнага тавараабароту ў сельскай мясцовасці падае. Ён ужо займае 13,4 %, а раней і да 20 % даходзіў. Напрыклад, летась ён быў 14 %. «Гэта значыць, кожны год адымаецца пакрыху доля сельскай мясцовасці. І гэта сведчыць пра тое, што сёння забеспячэнне насельніцтва абслугоўваннем гандлёвымі аб'ектамі недастатковае», — прывяла лічбы кіраўнік Белстата.

Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю адзначаў, што праблему не адмаўляе. Ён звярнуў увагу на тое, што распрацаваныя сацыяльныя стандарты ў частцы забеспячэння насельніцтва аб'ектамі гандлю выконваюцца. Калі казаць пра сельскую мясцовасць, то ў 26 населеных пунктах стандарты не выконваюцца. Але гэтыя населеныя пункты, размешчаныя літаральна за 100–200 метраў ад іншых, дзе дастаткова крам, у якіх абслугоўваюцца людзі. Артур Карповіч запэўніў, што ўсе гэтыя пытанні мясцовыя органы ўлады бачаць і кантралююць. Па словах міністра, пад увагай знаходзіцца і якасць прадукцыі. У гэтым удзельнічаюць і дэпутаты, і прадстаўнікі прафсаюза, і мясцовыя органы ўлады.

«Гандаль на вёсцы заўсёды быў і застаецца нашым прыярытэтам, бо мае высокае сацыяльнае значэнне. Пасля развалу Савецкага Саюза, у адрозненне ад іншых краін, нам удалося захаваць касцяк спажывецкай кааперацыі на вёсцы, якая і сёння працягвае працаваць. Так, колькасць яе аб'ектаў скарачаецца, гэта мы прызнаём. Але туды прыходзіць прыватны бізнес, малы бізнес, адкрываюцца новыя прадпрыемствы таварыстваў з абмежаванай адказнасцю», — адзначыў Артур Карповіч.

Міністр гандлю звярнуў увагу, што нярэдка скаргі ў інтэрнэце, у сацыяльных сетках не адпавядаюць рэчаіснасці, у асноўным гэта хайп і накруткі дзеля павелічэння колькасці падпісчыкаў. Прэзідэнт з гэтым пагадзіўся.

**«Сёння «ціктокаюцца»: ах, недзе пацукі пабеглі. Дык што, Прэзідэнт паедзе пацукоў лавіць? Гэта ж вы там на месцы са сметнікамі разабрацца не можаце, і ў вас пацукі бегаюць», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.**

Пры гэтым, падкрэсліў міністр гандлю, спажывец і яго прэтэнзіі і меркаванне застаюцца галоўным фактарам. Прэзідэнт на гэта заўважыў, што, як правіла, ідэалістычная карціна складваецца толькі ў дакладах. Але трэба ведаць, што робіцца на зямлі.

### ДА 1 СТУДЗЕНЯ ПА ГАНДЛІ ПАВІННА БЫЦЬ СІСТЭМА

Падводзячы вынікі нарады, Прэзідэнт паставіў дакладную і канкрэтную задачу: па гандлі павінна быць сістэма. У нас сістэмная дзяржава, падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што ў краіне ёсць рэгіёны (горад Мінск і вобласці), раёны, больш за 1400 аграгарадкоў, буйныя вёскі. Ёсць і маленькія хутаркі, і вёсачкі, якія называюць неперспектыўнымі. Там жывуць 7-10 чалавек, у асноўным пажылога ўзросту, але яны, зрабіў акцэнт кіраўнік дзяржавы, у свой час стваралі краіну.

**«Вось выходзячы з гэтага, вы павінны выпрацаваць сістэму абслугоўвання людзей. У вас разам з урадам 1 студзеня тэрмін. І не дай бог памочнікі і ўпаўнаважаныя ўбачаць хоць адну вёсачку, дзе «баба Дуня» не атрымала тое, на што яна ўсё жыццё працавала», — папярэдзіў Прэзідэнт.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што добрыя прыклады ёсць. Ёсць прыклады, калі мясцовае сельгаспрадпрыемства адкрывае ў вёсцы сваю краму, дзе ёсць усё неабходнае. Чаму б не выкарыстаць падобны вопыт? «Зрабіце па ўсёй краіне так. Гэта невялікія грошы. Задзейнічайце любыя рэсурсы», — даручыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы таксама даручыў праразвіваць усю краіну на прадмет таго, як жывуць людзі і як яны павінны жыць. Па яго словах, па сутнасці не так шмат для гэтага і трэба: «Важна забяспечыць асартымент. І цэнаўтварэнне. Галоўнае — цэны».

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

# «ПАТРЭБНА ЭФЕКТЫЎНАЯ СІСТЭМА АБСЛУГОЎВАННЯ Ў МАШТАБАХ КРАІНЫ»

Даслоўна

## «КІРАВАЦЦА ТРЭБА НЕ ТОЛЬКІ МЕРКАВАННЯМІ ПРЫБЫТКУ»

**Пра асноўныя пасылы, агучаныя кіраўніком дзяржавы на нарадзе, і пастаўленыя ім задачы адказныя асобы пасля расказалі журналістам.**

### ТРЭБА АКУРАТНА, УВАЖЛІВА І КРОПКАВА ВЫРАШАЦЬ



**Міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Артур КАРПОВІЧ** адзначыў, што, вырашаючы асноўную задачу — выпрацаваць выразную сістэму гандлёвага абслугоўвання насельніцтва, у першую чаргу ў сельскай мясцовасці, — важна дайсці да кожнага дома і да кожнага жыхара. Па яго словах, асноўная нагрузка тут ляжыць на мясцовых органах улады, але і МАРГ убаку не застанецца.

Журналісты пацікавіліся, хто будзе адказваць за абслугоўванне малых вёсак. «Я не думаю, што тут нейкая ўніверсальная формула. Сказаць, што гэта будзе выключна буйная гандлёвая сетка... Не, гэта залежыць ад знаходжання гандлёвага аб'екта, які найбліжэйшы гандлёвы пункт, якія аўтамагазіны абслугоўваюць насельніцтва. МАРГ будзе разглядаць гэтыя пытанні сумесна з аблвыканкамамі, каб выбудаваць надзейную сістэму гандлёвага абслугоўвання. Варта выключыць такія сітуацыі, пры якіх, напрыклад, сеткавы магазін пачне работу ў пэўным населеным пункце, а праз некаторы час проста адтуль сыдзе. Тут трэба акуратна, уважана і кропкава вырашаць», — растлумачыў Артур Карповіч.

На нарадзе ён дакладваў, што сёння на вёсцы актыўна развіваецца электронны гандаль. Журналісты ўдакладнілі, як знайсці баланс паміж інтэрнэт-крамамі і крамамі рэальнымі, стацыянарнымі. Па словах міністра, гэта сапраўды складанае пытанне: «Сёння чалавеку добра, ён купляе па інтэрнэце. А заўтра інтэрнэт-крама зачынілася, пастанавіла, што ёй гэта эканамічна нявыгадна, і сышла з гэтага раёна. Але да гэтага моманту ўжо і стацыянарны аб'ект зачыніўся, таму што яму стала нерэнтабельна працаваць з-за пакрыцця тэрыторыі інтэрнэт-крамай. Зноў жа тут няма адзінай формулы. Мясцовай уладзе, якая вывучае і ведае канкрэтную мясцовасць і канкрэтнага суб'екта, варта падпісваць з ім адпаведныя абавязацельствы. Проста так узяць і кінуць людзей, сысці з гэтага населенага пункта — гэта, па-першае, несправядліва, а па вялікім рахунку, недапушчальна. Таму мы будзем прымаць меры, каб падобных сітуацый не дапусціць», — сказаў Артур Карповіч.

Ён паведаміў, што насельніцтва часта па многіх пытаннях звяртаецца непасрэдна да кіраўніцтва Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. «Мы ў сваю чаргу адкрытыя для спажыўца праз Telegram-канал, праз наш сайт. Мы апытваем людзей, даведваемся, якія праблемы ёсць, даведваемся адрасы магазінаў і, выязджаючы, звязваючыся з мясцовай уладай, вырашаем тыя ці іншыя праблемы», — запэўніў Артур Карповіч.

### НЕ ЗАБЫВАЦЬ ПРА САЦЫЯЛЬНЫЯ ФУНКЦЫІ

Пра тое, як арганізаваны гандаль у сельскай мясцовасці, журналістам расказалі і старшыні аблвыканкамаў, якія таксама прысутнічалі на нарадзе. **Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Юрый КАРАЕЎ** галоўным вынікам нарады назваў пасыл кіраўніка дзяржавы аб тым, што не трэба толькі лічыць эканоміку тых, хто прадае і гандлюе на вёсцы. Гэта ўсё ж такі больш сацыяльная функцыя клопату пра нашых людзей.



Юрый Караеў вылучыў і патрабаванне ўзмацніць ролю вертыкалі ўлады — райвыканкамаў, сельсаветаў, дырэктараў гаспадарак — у рабоце з арганізацыямі гандлю. «Вядома, гандаль там, дзе мала пакупнікоў, стратны. Але за кошт іншых прэферэнцый, якія дадзены аблспажыўтаварыству, яны выцягваюць, як катамаран, і кампенсуюць свае выдаткі», — сказаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама. Ён звярнуў увагу, што кіравацца трэба не толькі меркаваннямі прыбытку, эканоміі або ўліку выдаткаў. Гэта, вядома, важна. Але ёсць і сацыяльныя функцыі. Па словах губернатара, для таго каб людзі жылі на вёсцы, каб працавалі ў сельскай гаспадарцы, каб туды ехала моладзь, ім неабходна ствараць усе ўмовы, забяспечыць асартымент тавараў у мясцовых крамах.

Юрый Караеў расказаў, што асабіста пастаянна камунікуе з кіраўніком абласной спажыўкааперацыі, цікавіцца праблемамі. «Я заўсёды стараюся вырашаць на яго карысць, таму што калі ён эканамічна паспяховы, то з яго можна спытаць. Калі стратны, то трэба глядзець, чаму, дзе закрэдытаванасць, чым дапамагчы. Можа, проста не хапае арганізатарскіх здольнасцяў», — сказаў старшыня аблвыканкама.

### ГЭТА ВАЖНАЕ КАДРАВАЕ ПЫТАННЕ...



**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК** галоўнай задачай назваў «дайсці да кожнага чалавека», каб кожны жыхар сельскай мясцовасці быў забяспечаны як харчовымі, так і нехарчовымі прадуктамі. Асноўную нагрузку нясе ў гэтым плане спажыўкааперацыя. «Вельмі важна, Прэзідэнт гэта падкрэсліў, нашы сеткі, якія працуюць у вялікіх гарадах, якія зарабляюць вялікія грошы, прыцягваць да вырашэння гэтага пытання. І замацоўваць за пэўнымі населенымі пунктамі, каб яны забяспечвалі стандартныя аб'ёмы тавараў, што патрэбныя людзям», — падкрэсліў губернатар. Пётр Пархомчык таксама звярнуў увагу на кадравае пытанне: знайсці прадаўца ў горадзе, у раённым цэнтры не праблема. А калі гаворка ідзе аб прадаўцу аўтакрамы, невялікай крамы ў вёсцы — тады жадаючых менш у тым ліку і з-за заробку. І на гэта трэба звярнуць увагу.





У **старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра СУБОЦІНА** спыталі пра сітуацыю з дзіцячым садком, якую згадваў на нарадзе кіраўнік дзяржавы. Губернатар расказаў, што мясцовыя органы ўлады разам з Міністэрствам адукацыі перыядычна праводзяць аптымізацыю падобных устаноў. Прычыны ў тым ліку і эканамічныя: калі колькасць навучэнцаў або выхаванцаў становіцца зусім невялікай, то ўтрымліваць такую ўстанову надта затратна. Больш эфектыўна арганізаваць падвоз дзяцей у суседнія населеныя пункты. У Віцебскай вобласці сёлета такім чынам былі зачыненыя 15 садкоў і каля 7 школ. Але ў разлік бярэцца мноства фактараў, абавязкова ўлічваюцца інтарэсы бацькоў і дзяцей. У садку ў аграгарадку Гаршчэўшчына сітуацыя была падобнай. Аднак, акрамя зусім малой колькасці выхаванцаў, самому будынку было неабходна сур'ёзнае абнаўленне, што патрабуе грошай. Таму было прынята рашэнне арганізаваць падвоз дзяцей у іншы населены пункт. Аднак бацькі на такое рашэнне абурыліся і праз той жа TikTok звярнуліся да Прэзідэнта.

Пасля дадатковага вывучэння пытання па дзіцячым садку ў аграгарадку Гаршчэўшчына вырашана яго захаваць. «Прэзідэнт патрабуе больш пільна падыходзіць да кожнага выпадку, бо мы змагаемся за кадравую палітыку на вёсцы, і калі там тыя, хто працуе, не згодны з нашым рашэннем, трэба рабіць адступленні і захоўваць. Гэты выпадак паказальны. І дзіцячаму садку ўсё роўна быць. Хоць з гэтай жа вёскі 21 дзіця возяць у суседнюю вёску ў школу. Таму як мінімум садок будзе ў гэтай вёсцы, а школа — у суседняй, каб захаваць населеныя пункты», — адзначыў Аляксандр Субоцін.

### ГАЛОЎНАЯ МЭТА — ЗАСЛУЖЫЦЬ СТАНОЎЧУЮ АЦЭНКУ ДЗЕЙНАСЦІ АД НАШАГА НАСЕЛЬНІЦТВА



**Старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Інеса КАРАТКЕВІЧ** заўважыла, што Белкаапсаюз — гэта не толькі гандаль. У яго структуру ўваходзіць прамысловая, нарыхтоўчая дзейнасць, арганізацыя грамадскага харчавання. Гэта міні-сектар эканомікі, які ажыццяўляе сваю дзейнасць на вёсцы.

«Ёсць вельмі шмат праблем. Гэта і неліквідныя дзеючыя актывы, зношанасць матэрыяльна-тэхнічнай базы, недахоп прафесійных кадраў. Мы над усім гэтым працуем. І правільна паставіў задачу кіраўнік дзяржавы, што гэтую работу трэба актыўней праводзіць з мясцовымі органамі ўлады. Нагрузка павінна размяркоўвацца справядліва», — падкрэсліла Інеса Караткевіч. У сістэме Белкаапсаюза працуе больш за 4 тысячы стацыянарных аб'ектаў, а таксама 482 аўтакрамы, якія абслугоўваюць амаль 13 тысяч населеных пунктаў.

«Белкаапсаюз — гэта і тавараправодная сетка беларускіх вытворцаў, таму што доля айчынных тавараў у абароце перавышае 90%. Незалежна ад нашай плацежаздольнасці мы заўсёды былі і будзем нацэлены на рэалізацыю тавараў айчыннай вытворчасці», — запэўніла Інеса Караткевіч. Акрамя таго, Белкаапсаюз рэалізоўвае і прадукцыю ўласнай вытворчасці — у яго структуру ўваходзіць больш чым 300 разнастайных магутнасцяў, цэхаў і ўчасткаў, якія ў асноўным нацэлены на рэалізацыю сваёй прадукцыі ва ўласнай гандлёвай сетцы.

«Мы вырашаем праблемы комплексна. Так, у нас у аб'ёме дзейнасці 64 % займае гандаль. Але станоўчы фінансавы вынік генерыруюць іншыя галіны, за кошт якіх мы можам кампенсаваць убыткі», — удакладніла Інеса Караткевіч.

Сёння не стаіць задача аб скарачэнні рознічнага тавараабароту на вёсцы. Ёсць праблема з кадрамі — аўтаматызацыя сыграла сваю ролю: не ўсе прадаўцы гатовыя працаваць з сучаснымі тэхналогіямі і новымі правіламі, таму людзі сыходзяць. «Мы аб'ектыўна атрымалі крытыку. Не паўсюль, але ёсць выпадкі рэалізацыі тавараў з пратэрмінаваным часам прыдатнасці. Гэта недапушчальна. Стараемся сачыць, каб такіх фактаў не было. Для гэтага ў нас арганізаваны ўнутрыведамасны кантроль», — адзначыла Інеса Караткевіч.

«Усе падыходы ўдасканальваюцца. Наша галоўная мэта — заслужыць станоўчую ацэнку дзейнасці ад нашага насельніцтва. Другая мэта — павысіць эфектыўнасць усіх галін. Сёння ўсе на гэта нацэлены. Узмоцнім работу з мясцовымі органамі ўлады ў адносінах размеркавання абслугоўвання менавіта населеных пунктаў з малой колькасцю насельніцтва», — падкрэсліла кіраўнік Белкаапсаюза.

Журналісты пацікавіліся, ці не разглядае Белкаапсаюз магчымасць адкрыцця буйных гандлёвых аб'ектаў у гарадах, як гэта робяць гандлёвыя крамы. Інеса Караткевіч адзначыла, што такая магчымасць ужо страчана. Але Белкаапсаюз шукае новы фармат гандлёвых аб'ектаў і нішы, якія яшчэ можна заняць. У прыклад яна прывяла «Магілёўскі аблкаапкнігагандаль» — унітарнае прадпрыемства, якое працуе ў сістэме Белкаапсаюза, і сёння яно паэтапна, з улікам фінансавых магчымасцяў, адкрывае так званыя дыскаўнтары па краіне. Ужо дзве крамы працуюць у Мінску.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СТРАТЭГІЯ НАШАЙ БУДУЧЫНІ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*






Як звярнуў увагу **старшыня праўлення РДГА «Беларускае таварыства «Веды» дэпутат Палаты прадстаўнікоў Вадзім ГІГІН**, фактычна пачынаецца новы грамадска-палітычны год, трэба зверыць гадзіннікі. «Час патрабуе таго, каб мы пастаянна прымянялі новыя формы работы, і таварыства «Веды» на гэта арыентавана, — сказаў ён. — Нядаўна адбылася вялікая нарада па рэалізацыі Дырэктывы Прэзідэнта № 12. Калі ўважліва чытаць яе, то гэта не проста змяненне формы падачы, а і рост дынамікі грамадскіх працэсаў, стаўка на палітычна актыўных грамадзян».

Па словах парламентарыя, у плане тэхналогій акцыя «Беларусь адзіная» адпавядае патрабаванням часу. Прадугледжаны работа чат-бота, выкарыстанне тэхналогій штучнага інтэлекту. «Але форма ніколі не павінна замяняць змест, — падкрэсліў Вадзім Гігін. — Галоўнае — адкрытая, сумленная размова з аўдыторыяй. Гэта наш моцны бок. Ужо не раз было даказана ў час даволі сур'ёзных выпрабаванняў, што прамы дыялог з аўдыторыяй — магчымасць падтрымліваць паразуменне, выбудоўваць грамадзянскую супольнасць, кансалідаваць нашы патрыятычныя сілы».

Тэматыка сустрэч — стратэгія будучыні. Як адзначыў Вадзім Гігін, шмат гаворыцца пра гісторыю, на слыху палітычны парадак сённяшняга дня. Акцыя накіравана на абмеркаванне арыенціраў на будучыню. «Мы ўступілі ў пяцігодку якасці, — канстатаваў ён. — Якой будзе наша Беларусь праз пяць гадоў? Якія нашы мары, якія мы ставім мэты — дзяржава, грамадства, кожны чалавек асобна, прадпрыемствы? Яны павінны ў прынцыповых момантах супадаць. Мы павінны абазначаць выклікі і пагрозы. Ні ў якім разе не расслабляцца, усведамляць свае рэзервы, рэсурсы, якія, магчыма, дзесьці не выкарыстаны, для таго каб упэўнена рухацца наперад».






Першая сумленная размова пра вобраз будучай Беларусі адбылася ў Барысаве. Геаграфія акцыі ахопіць усе рэгіёны краіны і завершыцца 12 верасня. Па выніках будуць зроблены высновы, якія пытанні хвалююць людзей, які грамадскі настрой.

У рэгіёнах рыхтуюцца да правядзення акцыі, яе чакаюць. Вопыт «Марафону адзінства» паказаў, што ў Беларусі могуць не проста эфектыўна працаваць сучаснымі метадамі, а нават дзейнічаць на апярэджанне. Такі вопыт важна маштабаваць, прасоўваць.

**Паводле БелТА.**
**Фота БелТА.**

ПЕРСПЕКТЫВА

# ЯК УТАЙМАВАЦЬ ШТУЧНЫ ІНТЭЛЕКТ?

## Задача навукоўцаў — рэалізаваць мары аб развіцці ШІ і мінімізаваць рызыкі

Задача вучоных — зрабіць так, каб мары ў сферы развіцця штучнага інтэлекту (ШІ) рэалізаваліся, а рызыкі — не. Аб гэтым на фарсайт-сесіі заявіў старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір КАРАНІК, паведаміла БелТА.



«Стаўленне да штучнага інтэлекту на працягу часу змянялася. Спачатку гэта былі мары аб тым, што ён выканае ўсю працу за чалавека. Потым гэта былі страшылкі, што ён загубіць чалавецтва. Цяпер гэта стала рэальнасцю. Ён шчыльна ўвайшоў у наша жыццё. Сфера прымянення вельмі шырокая. Пачынаючы з таго, што мы кожны дзень бачым — разумныя калонкі, галасавыя асістэнты ў прыладах мабільнай сувязі, — і заканчваючы больш канкрэтным укараненнем у вытворчасць. Напрыклад, машынны зрок, які аўтаматызуе працэсы, павышае якасць прадукцыі. Гэта і сістэмы падтрымкі і прыняцця рашэнняў у ахове здароўя, адміністрацыйным упраўленні. Гэта ўжо рэальнасць, якая істотна ўплывае на жыццё людзей і эканоміку», — адзначыў Уладзімір Каранік.

По ініцыятыве Нацыянальнай акадэміі навук падрыхтаваны мадэльны закон аб тэхналогіях штучнага інтэлекту, які з'яўляецца асновай для прыняцця такіх законаў ва ўсіх краінах СНД. «На фарсайт-сесіі сабраліся спецыялісты, якія вызначаюць, як будзе развівацца штучны інтэлект у нашых краінах, што мы можам прапанаваць адзін аднаму і як зрабіць так, каб гэтае развіццё было бяспечным і накіраваным на карысць чалавецтва і эканомікі», — звярнуў увагу старшыня Прэзідыума НАН. Паводле яго слоў, работа па развіцці ШІ праводзіцца ва ўсіх краінах. «Калі мы хочам быць канкурэнтаздольнымі, не залежаць ад пастаўшчыкоў гэтых паслуг з іншых краін, мы павінны развіваць свае тэхналогіі», — падкрэсліў Уладзімір Каранік.





**Міністр сувязі і інфарматызацыі Кірыл ЗАЛЕСКІ** адзначыў, што цяпер актуальна гаварыць аб тым, дзе трэба прымяняць штучны інтэлект для паскарэння працэсаў ва ўсіх сферах грамадскіх адносін. «Попыт вялікі. Гэта і ўкараненне ШІ ў існуючыя інфармацыйныя сістэмы, якія ёсць у краіне, а таксама прымяненне яго пры іх распрацоўцы», — звярнуў увагу ён.



**Віцэ-прэм'ер Расіі Дзмітрый ЧАРНЫШЭНКА** наведаў Нацыянальную акадэмію навук Беларусі, паўдзельнічаў у семінары, прысвечаным Міжнароднаму фарсайту ў сферы штучнага інтэлекту, а таксама абмеркаваў супрацоўніцтва з Беларуссю ў сферы ШІ. Ён падзякаваў вучоным за праведзеную работу. «Выконваючы задачы па даследаванні штучнага інтэлекту, мы разам з нашымі вучонымі, міжнароднымі экспертамі вызначылі 10 кірункаў фундаментальных даследаванняў. Мы лічым, што яны павінны прадвызначыць будучыню. Таксама яны ляглі ў аснову міжнароднага фарсайту, — падкрэсліў расійскі віцэ-прэм'ер. — Для пачатку нам трэба расставіць прыярытэты паміж гэтымі фундаментальнымі кірункамі, каб вылучыць стратэгічна важныя з іх менавіта для міжнароднага супрацоўніцтва. Паспрабуем вызначыць асноўныя навуковыя задачы ўнутры гэтых кірункаў: з чаго варта пачаць, каб выбудаваць правільны навуковы парадак дня. Структура ўсіх гэтых кірункаў — не статычная, яе трэба актуалізаваць, абнаўляць. Я ўпэўнены, што разам з вамі мы зможам зрабіць новыя адкрыцці. У нас назапашаны вялікі досвед укаранення вынаходстваў».



**В.а. дырэктара расійскага Стратэгічнага агенцтва падтрымкі і фарміравання ШІ-распрацовак Кірыл ЗЕМЛЯНУХІН** адзначыў, што ў ходзе абмеркавання падчас фарсайт-сесіі і ў ходзе рабочых дамоўленасцяў намеціліся некалькі магчымых кірункаў супрацоўніцтва. «Мы вельмі шмат даведаліся, паглядзелі на беларускі бок. Пачулі таксама пра кірункі магчымага навуковага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі і арганізацыямі. Паспрабуем іх недзе запусціць, а недзе рэанімаваць, пазнаёміць людзей, каб структураваць новыя сумесныя праекты, — заўважыў Кірыл Землянухін. — Расійскі бок зацікаўлены ў праектах аб выкарыстанні ШІ ў хіміі, медыцыне, а канкрэтна анкалогіі. Паспрабуем таксама вырашыць праблему даступнасці вылічальных магутнасцяў для беларускіх арганізацый, якія займаюцца даследаваннямі».



Узровень развіцця штучнага інтэлекту ў Беларусі і Расіі дастаткова высокі і практычны. Аб гэтым заявіў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей КРУГЛІКАЎ**. «Калі разглядаць тэорыю будучыні, то штучны інтэлект прыйдзе ва ўсе сферы дзейнасці. Абсалютна. З чагосьці трэба пачынаць, рухацца наперад, развіваць свае алгарытмы, фарміраваць уласныя моўныя мадэлі», — падкрэсліў Сяргей Кругліка́ў. Ён адзначыў, што штучнага інтэлекту не трэба апасацца, але пры гэтым трэба вызначыць рэальныя выклікі, рызыкі і пагрозы для таго, каб на заканадаўчым узроўні спыніць іх рэалізацыю ў новых алгарытмах, якія будуць ствараться ў нашых краінах.

# СТАЎКА НА ЭКСПАРТ

## Беларусь і Валагодская вобласць развіваюць аграрнае супрацоўніцтва

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Юрый ГОРЛАЎ правёў рабочую сустрэчу з міністрам сельскай гаспадаркі і харчовых рэсурсаў Валагодскай вобласці Расійскай Федэрацыі Сяргеем ВАРАПАЕВЫМ.

Бакі канстатавалі дынамічнае развіццё двухбаковага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, паведаміла прэс-служба міністэрства. Яскравым сведчаннем таму з'яўляюцца станоўчыя вынікі работы за студзень—чэрвень 2025 года. Так, тавараабарот паміж Беларуссю і Валагодскай вобласцю вырас на 12 % да аналагічнага перыяду 2024 года. Аб'ём беларускага экспарту харчовых тавараў у рэгіён павялічыўся ў 1,3 раза.



Сёлета беларускія вытворцы асвоілі пастаўкі ў Валагодскую вобласць новых відаў прадукцыі: ялавічыны, бульбы, морквы, кандытарскіх вырабаў з цукру. Таксама новымі напрамкамі экспарту сталі пастаўкі насення лёну апрацаванага і лёну-сырцу. Акрамя таго, Валагодчыну зацікавілі беларускія джэмы, фруктовыя жэле, мармелад.

Працягваецца паспяховае супрацоўніцтва ў аграрнай навукова-адукацыйнай сферы ў рамках пагадненняў паміж беларускімі аграрнымі ВНУ і Валагодскай дзяржаўнай малочнагаспадарчай акадэміяй імя М. В. Верашчагіна.

На перагаворах была выказана зацікаўленасць беларускага боку ў далейшым нарошчванні экспарту, уключаючы пастаўкі амінакіслот і насення сельскагаспадарчых культур.

# КАРАВАЙ ПАЦЯЖЭЎ

## Гаспадаркі Брэсцкай вобласці завяршылі ўборку збожжавых каласавых культур

Як паведаміў БелТА намеснік старшыні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама Віталь РУДЗЬ, завершана ўборка збожжавых каласавых, засталося толькі завяршыць уборку лубіну.




На раніцу 26 жніўня было намалочана 1 млн 497 тыс. тон (без уліку рапсу). Гаспадаркі рэгіёна прыступілі да ўборкі грэчкі, проса, яравога рапсу.

У параўнанні з мінулым годам вага каравая Брэсцкай вобласці павялічылася на 184 тыс. тон. Сярэдняя ўраджайнасць склала 45,2 ц/га, што больш на 7,9 ц/га ў параўнанні з мінулым годам.

У аблсельгасхарчы назвалі пяцёрку лідараў жніва па вале збожжа. Найбольш яго атрымалі ў Баранавіцкім раёне — 180 тыс. тон. Аграрыі Пружанскага раёна намалацілі 136,6 тыс. тон, Камянецкага — 114,4 тыс. тон, Кобрынскага і Столінскага — па 111,6 тыс. тон. Усяго ў Брэсцкай вобласці сёлета восем раёнаў пераадолелі планку па намалоце больш за 100 тыс. тон.

Што да ўраджайнасці, то самая высокая склалася на палях Ляхавіцкага раёна. У сярэднім з аднаго круга там атрымлівалі 53,3 цэнтнера (на 6,4 цэнтнера больш, чым летась). Далей ідуць Столінскі (52,4 ц/га) і Баранавіцкі (51,2 ц/га) раёны.

Канчатковыя вынікі ўборачнай кампаніі на Брэстчыне падвядуць на абласных «Дажынках», якія пройдуць у Белаазёрску Бярозаўскага раёна.

Намеснік старшыні Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні таксама адзначыў, што сельгаспрадпрыемствы вобласці ўжо завяршылі сяўбу азімага рапсу. Тры раёны — Брэсцкі, Камянецкі і Маларыцкі — пачалі ўборку кукурузы на сілас. У цэлым па вобласці ўбрана больш як 2/3 траў трэцяга ўкосу.

# НАДВОР'Е СПРЫЯЕ

## У краіне палепшацца ўмовы для паспявання збожжа кукурузы

У Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды паведамілі, што палепшацца ўмовы для паспявання збожжа кукурузы і назапашвання цукроў у бураках.

«На большай частцы тэрыторыі краіны ўмовы для апрацоўкі глебы пад сяўбу азімых збожжавых культур і правядзення сяўбы азімага рапсу складаюцца ў цэлым спрыяльна. Верхні пласт глебы ў большасці раёнаў краіны добра ўвільготнены, што дазваляе правядзенню ўсіх відаў палявых работ. Пры гэтым у многіх паўднёва-заходніх раёнах, месцамі ў цэнтральным рэгіёне і на ўсходзе краіны, дзе адзначаецца недабор ападкаў, захоўваецца слабое ўвільгатненне, што ў спалучэнні з халодным надвор'ем пагаршае ўмовы для прарастання насення і з'яўлення ўсходаў азімага рапсу, росту караняплодаў, адрастання траў», — расказалі ў Белгідрамеце.

Паводле прагнозаў, у найбліжэйшы час на фоне чаканага павышэння тэмпературнага рэжыму аграметэаралагічныя



ўмовы для паспявання зерня кукурузы і назапашвання цукроў у караняплодах буракоў палепшацца. Прагназуемыя дажджы будуць мець кароткачасовы характар і не павінны ўскладняць завяршэнне ўборкі збожжавых каласавых культур, нарыхтоўку кармоў і ўборку бульбы.



# ЗНАЧНЫ ПРЫРОСТ

## Сельгасарганізацыі Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта больш чым на 20 % павялічылі збор збожжа

Сельскагаспадарчыя арганізацыі Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта практычна завяршылі ўборку збожжавых і зернебабовых культур, убрана 97 % плошчаў, паведамілі БелТА ў Кіраўніцтве справамі.

«Нягледзячы на тое што тэрміны збору ўраджаю з-за ўмоў надвор'я аказаліся больш працяглымі, ураджай нядрэнны, — адзначылі ў ведамстве. — Намалочана больш за 166,7 тыс. тон збожжа, што на 22 % больш, чым у мінулым годзе. Дадаткова атрымана 30 тыс. тон збожжа (без уліку кукурузы)».

У перадавіках па валавым зборы ўраджаю такія гаспадаркі, як ААТ «Васілішкі» са Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці, дзе намалацілі 44,4 тыс. тон, ААТ «Ціхінічы» з Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці і ААТ «Александрыйскае» са Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці з намалотам больш за 21 тыс. тон збожжа ў кожным.

Значна вырасла ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур. У сярэднім па гаспадарках двух аграхолдынгаў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта яна склала 52,8 ц/га (летась — 42,3 ц/га). У многіх гаспадарках гэты паказчык значна вышэйшы за сярэдні. Напрыклад, у ДП «Усход» (Мінскі раён) ураджайнасць збожжавых — 84,7 ц/га (у 2024 годзе — 82,8 ц/га), у ААТ «Васілішкі» — 69,4 ц/га (у 2024 годзе — 64,5 ц/га).

Цяпер гаспадаркі працягваюць нарыхтоўку травяных кармоў. Ужо нарыхтавана 40 % ад планавага аб'ёму сена і больш за 80 % ад планавага аб'ёму сенажу. Усяго сёлета плануецца нарыхтаваць 12 тыс. тон сена і 344 тыс. тон сенажу. Паступова гаспадаркі прыступаюць да ўборкі кукурузы на сілас, нарыхтоўка якога чакаецца ў аб'ёме каля 520 тыс. тон. Гэта дазволіць сфарміраваць у гаспадарках добры запас кармоў для буйной рагатай жывёлы на зімовы перыяд.

**Даведачна.** *У склад двух аграпрамысловых холдынгаў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта ўваходзіць 13 прадпрыемстваў, 11 з якіх займаюцца вырошчваннем сельскагаспадарчых культур. Акрамя таго, збожжавыя і зернебабовыя культуры вырошчваюць два нацыянальныя паркі — «Нарачанскі» і «Браслаўскія азёры».*

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
27 жніўня 2025 г. № 31 (812)

НА СЛЫХУ

# ХУТКА ВІЦЕБСК ЗНОЎ БУДЗЕ ПРЫМАЦЬ ГАСЦЕЙ

## 2-3 верасня тут пройдзе беларуска-ўзбекскі жаночы бізнес-форум

**Сёлета ўсе мерапрыемствы будуць аб'яднаны агульнай тэмай «Беларусь — Узбекістан: супрацоўніцтва як фактар устойлівага развіцця».**

Як паведамілі ў Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, гэта ўжо будзе трэці па ліку жаночы бізнес-форум, дзе яго ўдзельнікі абмяркуюць актуальны парад дня на пленарным пасяджэнні і 7 тэматычных секцыях, прысвечаных розным кірункам супрацоўніцтва. Так, першая секцыя будзе прысвечана рэалізацыі праектаў у лёгкай прамысловасці, другая — перспектывам супрацоўніцтва ў сферы машынабудаўнічага комплексу, трэцяя — бізнес-партнёрству ў індустрыі турызму, чацвёртая — двухбаковаму супрацоўніцтву ў сацыяльна-эканамічнай сферы, пятая — у аграпрамысловым сектары, шостая — маладзёжнаму супрацоўніцтву і, нарэшце, сёмая — ролі мясцовага самакіравання ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця рэгіёнаў Беларусі і Узбекістана.

Таксама ў рамках форуму адбудзецца пасяджэнне беларуска-ўзбекскага дзелавога савета і традыцыйная ўжо выстаўка дасягненняў народнай гаспадаркі рэгіёнаў дзвюх краін.

# КЛЮЧАВЫ РЭСУРС, АД ЯКОГА ЗАЛЕЖЫЦЬ БУДУЧЫНЯ

## У Гродне абмеркавалі рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі

Мерапрыемства адбылося на базе аддзялення Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў (БІСД). У дыскусіі ўзялі ўдзел прадстаўнікі абласнога і мясцовых Саветаў дэпутатаў, эксперты БІСД, лідары маладзёжных арганізацый, аналітыкі і моладзь, якая працуе на вядучых прадпрыемствах і ў арганізацыях рэгіёна.

Абмеркаванне адбылося ў рамках сацыялагічнага даследавання «Аб жыццёвых стратэгіях працоўнай моладзі Гродзенскай вобласці». Дыялогавая пляцоўка стала заканамерным працягам даследчай працы. У даследаванні ўдзельнічалі больш за 2000 рэспандэнтаў. Яго вынікі ляглі ў аснову абмеркавання найважнейшых вектараў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Асаблівая ўвага ўдзялялася маладым сем'ям, працаўладкаванню, а таксама пытанням грамадзянскага і патрыятычнага выхавання.

Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта адзначыла, што на Гродзеншчыне дэпутаты ўдзяляюць шмат увагі моладзі:

— Наша місія заключаецца ў фарміраванні ўмоў для ўзаемадзеяння і ўдзелу моладзі ў грамадскім жыцці краіны. Размова дае магчымасць адкрыта прадставіць ідэі, якія могуць быць рэалізаваны на Гродзеншчыне. Мы разумеем, што моладзь — гэта ключавы рэсурс, ад якога залежыць будучыня дзяржавы. Меркаванні маладых людзей улічваюцца, іх пажаданні вітаюцца, а ініцыятывы падтрымліваюцца.

Сяргей Валчкевіч, аналітык Гродзенскага аддзялення БІСД, падкрэсліў, што ў нашай краіне работа з моладдзю заўсёды была і будзе прыярытэтным кірункам:

— Удзельнікамі дыялогу стала актыўная моладзь рэгіёна. Нам цікава паслухаць іх меркаванне аб рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў Беларусі. Мы атрымалі вынікі даследавання, на іх аснове выбудавалі адносіны па ключавых аспектах, звязаных з сямейнымі каштоўнасцямі, самарэалізацыяй і працоўнай дзейнасцю.

Маладыя людзі актыўна ўключаліся ў дыялог, дзяліліся сваімі думкамі. **Спецыяліст аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Зэльвенскага райвыканкама Марыя ШМЫГІНА** зазначыла, што ў Беларусі моладзь атрымлівае значную падтрымку, а такія мерапрыемствы паказваюць, што меркаванне кожнага мае значэнне, што маладых людзей чуюць, аказваюць дапамогу.

— У Зэльвенскім раёне я займаюся грамадзянскай ініцыятывай па ўвекавечанні памяці аб падзеях Вялікай Айчыннай вайны. Мясцовыя ўлады актыўна падтрымалі маю ідэю, і мы цяпер працуем над стварэннем помніка каля дарогі Р-99, дзе праходзілі важныя стратэгічныя бітвы ў гады вайны.

**Мацвей ЛЯНЦЭВІЧ, студэнт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і супрацоўнік хуткай медыцынскай дапамогі**, упэўнены, што беларуская моладзь валодае велізарным патэнцыялам і мноствам яркіх ідэй.

— У Беларусі ініцыятыўная і прадпрымальная моладзь. Маладыя людзі, якія валодаюць ведамі ў розных галінах — ад навукі і тэхналогій да мастацтва, — аб'ядноўваюцца для абмену ідэямі і супрацоўніцтва. Гэты рух становіцца ўсё больш прыкметным і значным, спрыяючы развіццю грамадства і краіны ў цэлым. Дыялогавая пляцоўка — гэта яркі прыклад такога ўзаемадзеяння. Яна аб'яднала прадстаўнікоў розных людзей, ствараючы прастору для адкрытага абмеркавання актуальных пытанняў і пошуку канструктыўных рашэнняў. Тут маладыя людзі маглі прадставіць свае ідэі, атрымаць зваротную сувязь ад больш вопытных калег і наладзіць карысныя кантакты для далейшага развіцця.

Падобныя ініцыятывы адыгрываюць важную ролю ў фарміраванні актыўнай грамадзянскай супольнасці, дзе кожны чалавек мае магчымасць зрабіць свой унёсак у агульную справу. Яны спрыяюць развіццю крытычнага мыслення, крэатыўнасці і лідарскіх якасцяў у моладзі, што асабліва важна ва ўмовах хутка зменлівага свету.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**





Фота БелТА.

**Маладым спецыялістам — асаблівая ўвага. Напрыклад, работнікаў культуры Гродзеншчыны пасвяцілі ў прафесію падчас культзлёту «Праект «Мастацтва» на Аўгустоўскім канале.**

Центр Промышленной Оценки

• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Лидахлебопродукт», Гродненская область, г. Лида, ул. Булата, 1. УНП 500022448. Тел. (0154) 65 25 01 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1. Здание подсобного цеха, 470,5 кв. м** (здание специализир. сельскохоз. назначения, инв. № 420/С-48430). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Тарновский с/с, аг. Далекие, ул. Первомайская, д. 30.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. 0,1834 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания подсобного цеха (ведения товар. сельского хозяйства). Ограничения (обременения): зона санит. охраны поверхностных и подземных источников водоснабжения хозяйственно-питьевого назначения

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 105 000,00 бел. руб.**

**Лот № 2. Здание склада «Лакокраска», 411,8 кв. м** (здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ, инв. № 421/С-2410). Адрес: **Гродненская обл., Вороновский р-н, Бастунский с/с, д. Бастуны, ул. Железнодорожная, 17А**. ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,0484** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания склада «Лакокраска

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 39 480,00 бел. руб.**

**Лот № 3. Здание механической мастерской 325,3 кв. м** (здание специализир. сельскохоз. назначения, инв. № 420/С-47034). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/1, мехмастерская в районе д. Евсеевичи.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **1,3546** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания механич. мастерских. Ограничения (обременения): охранные зоны электрич. сетей (пл. 0,0314 и 0,1053 га)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 28 320,00 бел. руб.**

**Лот № 4. Здание гаража 817,5 кв. м** (здание специализир. сельскохоз. назначения, инв. № 420/С-47032). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/2, гараж в районе д. Евсеевичи.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **1,1350** га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания гаража. Ограничения (обременения): охранные зоны электрич. сетей (пл. 0,0485 га)

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 70 680,00 бел. руб.**

**Лот № 5. Здание зерносклада 576,4 кв. м** (здание специализир. сельскохоз. назначения, инв. № 420/С-47036). Адрес: **Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 13/5, зерносклад в районе д. Евсеевичи.** ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,3517** га предоставлен на праве аренды (срок действия: по 16.05.2072) для строительства и обслуживания зерносклада

**Начальная цена лота № 5 с НДС 20 % – 49 800,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней** после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. Расходы, связанные с государственной регистрацией сделки, несет покупатель

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение в размере по лоту № 1 – 4 %, по лотам №№ 2–5 – 6 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения торгов

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.09.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 29.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА —

## Гатоўнасць школ да новага навучальнага года і разнастайнасць

Лічаныя дні застаюцца да той пары, як школы напоўняцца дзіцячым смехам. Падрыхтоўчыя мерапрыемствы да новага навучальнага года скончаны. Усё гатова для таго, каб прыняць каля 1 мільёна 50 тысяч навучэнцаў, якія 1 верасня сядуць за парты і адправяцца ў цікавае падарожжа на шляху да ведаў. Бацькі клапоцяцца пра знешні выгляд сваіх школьнікаў, а таксама напаўненне іх ранцаў, а таму вялікая колькасць людзей у аддзелах адзення і канцылярыі ў апошнія жнівеньскія дні — справа звычайная.





Ці хопіць на ўсіх прыгожых касцюмаў дзелавога стылю, афіцыйнага і спартыўнага абутку, сшыткаў, вокладак, ручак, пэндзляў і іншых атрыбутаў школьніка, правяраюць і парламентарыі. Асаблівую ўвагу члены Савета Рэспублікі і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў удзяляюць гатоўнасці школ да новага навучальнага года непасрэдна на месцах.

### УСЁ ДЛЯ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

Увага парламентарыяў скіравана як на гарадскія, так і сельскія навучальныя ўстановы. Напрыклад, **член Савета Рэспублікі Андрэй КРЫВАНОСАЎ** напярэдадні Дня ведаў наведаў Сасноваборскую сярэднюю школу і Светлагорскую сярэднюю школу № 11, якія, па яго словах, ззяюць свежасцю і чысцінёй.

«Да 1 верасня ў школах правялі капітальны рамонт: змяніліся навучальныя аўдыторыі, лабараторыі, спартыўныя залы, абнавіліся фасады, — канкрэтызаваў Андрэй Крываносаў. — У кожным кабінеце да работы гатова новае абсталяванне, а школьныя дошкі ўпрыгожваюць прывітальныя надпісы і віншаванні для вучняў».

Асаблівую ўвагу сенатар удзяліў кадраваму патэнцыялу школ. Ён распавёў, што ў Сасноваборскай школе захоўваюцца і прымнажаюцца найлепшыя традыцыі калектыву. «Яскравы доказ — неверагодна высокі працэнт настаўнікаў, якія з'яўляюцца тутэйшымі выпускнікамі, — падкрэсліў член Савета Рэспублікі. — Да 85 % педагогаў некалі самі сядзелі за партамі ў гэтых сценах, а сёння яны навучаюць новыя пакаленні дзяцей».

У новым навучальным годзе Сасноваборская сельская школа расчыніць свае дзверы для 190 вучняў. Сярод іх — 18 першакласнікаў. Сустракаць хлопчыкаў і дзяўчынак будзе дружная каманда з 28 педагогаў, гатовых весці сваіх падапечных да новых ведаў і дасягненняў.

«Абедзве школы чакаюць сваіх вучняў — будучых актывістаў, спартсменаў і выдатнікаў, — рэзюмаваў Андрэй Крываносаў. — Тут створаны ўсе ўмовы для таго, каб дзеці маглі атрымліваць якасную адукацыю і ўсебакова развівацца. Але галоўнае, што ў школах працуюць настаўнікі, для якіх прафесія стала прызваннем. Такія спецыялісты — асноўная каштоўнасць айчыннай сістэмы адукацыі».

Падчас работы ў сваёй Мазырскай выбарчай акрузе № 42 **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Аксана КАВАЛЬКОВА** наведала шэраг устаноў адукацыі раёна, ацаніўшы іх гатоўнасць да новага навучальнага года. Дэпутат адзначыла праведзеную маштабную работу, у выніку якой створаны камфортныя і бяспечныя ўмовы для навучання і развіцця дзяцей.

«Да пачатку навучальнага года ў школах абноўлены навучальныя класы, спартыўныя залы, сталовыя, іншыя памяшканні, — канстатавала Аксана Кавалькова. — Асобная ўвага была ўдзелена рамонту дахаў, сістэм ацяплення і электразабеспячэння. Каб зрабіць навучальны працэс больш цікавым і эфектыўным, набыты новая навучальная літаратура, сучасныя камп'ютары, інтэрактыўныя дошкі, іншае неабходнае абсталяванне. Узмоцнены меры бяспекі: устаноўлены сістэмы відэаназірання, абноўлены супрацьпажарныя сістэмы. Прыведзены ў парадак прылеглыя тэрыторыі, спартыўныя пляцоўкі, створаны зоны адпачынку для вучняў. Асаблівая ўвага ўдзелена стварэнню ўмоў для інклюзіўнай адукацыі, каб кожнае дзіця незалежна ад сваіх асаблівасцяў магло атрымаць якасную адукацыю і развівацца ў камфортным асяроддзі».

Па словах парламентарыя, педагагічныя калектывы школ з энтузіязмам рыхтуюцца да сустрэчы з вучнямі, распрацоўваюць новыя адукацыйныя праграмы і методыкі, каб зрабіць навучальны працэс больш цікавым і эфектыўным. Дэпутат адзначае высокі ўзровень падрыхтоўкі асобных устаноў, творчы падыход педагагічных калектываў да арганізацыі адукацыйнага працэсу і актыўны ўдзел бацькоў у падрыхтоўцы да навучальнага года.

У ходзе наведвання школ Аксана Кавалькова ўнесла шэраг прапаноў, накіраваных на паляпшэнне ўмоў навучання і выхавання навучэнцаў, працы работнікаў. Прапановы і заўвагі прагучалі і ў адказ.

«Для мяне вельмі важны прамы дыялог з тымі, хто кожны дзень працуе





Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белцветмет», Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, 42/2, район аг. Гатово. УНН 100088666 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |

**Предмет электронных торгов:** бывшее в употреблении имущество. Местоположение – Минский р-н, Новодворский с/с, аг. Гатово, 42/2

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Полуприцеп специальный самосвал MAZ 953000-017P** (2016 г. в.) и **седельный тягач MAZ 643019-8429-012** (2014 г. в.) | **80 064,00** |
| 2 | **Грузовой специальный подъемник гидравлический GAZ-3309 PMS-318-02,** 2010 г. в. | **54 720,00** |

***Цена снижена на 20 %. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены***

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять)** рабочих дней со дня завершения электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | **10 (десять)** рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи |

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение 5 % от цены продажи лотов в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.08.2025

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 10.09.2025.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания
• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (электронного аукциона)**

**Тринадцатые повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 16.08.2025 в газете «Звязда» № 157 (30545), стр. 7**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. без НДС | Минимальная цена, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение (квартира) 23 по адресу: Минская область, Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Строителей, д. 53, общей площадью по СНБ 121,5 кв. м. Количество жилых комнат: 4 | 288 141,33 | 201 698,93 |

**Задаток:** 5 % от начальной цены предмета электронного аукциона. В белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP3012300094564 0000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи – 10 (десять) рабочих дней** после электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона – 10 (десять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи.
**Переход права собственности** – после полной оплаты имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресам: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник, которому будет предложен для приобретения предмет электронного аукциона (претендент на покупку), обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 0,7 % от конечной цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронного аукциона

Организатор электронного аукцион имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 08.09.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00.
Заявки на участие в электронном аукционе принимаются **с 27.08.2025 с 09:00 по 05.09.2025 г. до 16.00.**
Электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

# БЯСПЕЦЫ І ДАСТУПНАСЦІ

## школьнага асартыменту — у полі зроку парламентарыяў

на перадавой нашай адукацыі — з педагогамі і кіраўнікамі, — звяртае ўвагу дэпутат. — Іх прапановы — не абстрактныя ідэі, а рэальныя шляхі вырашэння набалелых праблем. Усе агучаныя прапановы і заўвагі будуць прааналізаваны, вынесены на абмеркаванне ў рамках профільных ведамстваў для пошуку механізмаў іх рэалізацыі. Наша агульная задача — стварыць для падрастаючага пакалення ўмовы для атрымання якаснай адукацыі і гарманічнага развіцця асобы».

### АДЗЕННЕ І КАНЦЫЛЯРЫЯ — УСІМ ПА КІШЭНІ

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў па Пухавіцкай выбарчай акрузе № 65 Алена ПАРХІМЧЫК** ажыццявіла маніторынг школьнага асартыменту ў гандлёвых аб'ектах Старадарожскага раёна, які разам з часткай Слуцкага таксама ўваходзіць у зону яе адказнасці. Найперш парламентарыя хвалявала разнастайнасць тавараў, якія задавальняюць патрэбы кожнага пакупніка.

«Крамы прапануюць шырокі выбар: пачынаючы ад канцтавараў і заканчваючы адзеннем, аксесуарамі, — расказвае дэпутат. — Цэнавы дыяпазон прымальны для людзей з розным узроўнем дастатку, што дазваляе кожнай сям'і знайсці ідэальныя рашэнні для падрыхтоўкі сваіх дзяцей да новага навучальнага года. Вялікі выбар тавараў айчыннай вытворчасці выдатнай якасці і дызайну. У нас ёсць усё неабходнае, каб зрабіць пачатак навучальнага года камфортным і радасным для ўсіх».

Азнаёмілася Алена Пархімчык і з гатоўнасцю да новага навучальнага года шэрагу школ, якія знаходзяцца ў выбарчай акрузе. Для былога галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Пухавіцкага раёна падобнае мерапрыемства не ў навінку. Дзякуючы папярэдняму вопыту, дэпутат добра ведае, з якімі праблемамі сутыкаюцца школы напярэдадні чарговага 1 верасня.

«Праведзены рамонтныя мерапрыемствы, абнаўленне школьнай мэблі, абсталявання, задзейнічанага ў навучальным працэсе, — канкрэтызуе парламентарый. — У прыватнасці, у гімназіі горада Старыя Дарогі заменены агароджа, уваходная група, разбіты прыгожыя сучасныя клумбы. Літаральна на ўваходзе ва ўстанову адукацыі і ў школьнікаў, і ў настаўнікаў будзе панаваць святочны настрой».

Пры наведванні школ найперш дэпутат звяртае ўвагу на стварэнне бяспечнага асяроддзя для навучэнцаў. «Асаблівая ўвага ўдзяляецца асвятленню ў класах, падбору мэблі згодна з індывідуальнымі асаблівасцямі дзіцяці — усё для таго, каб, наведваючы ўрокі, школьнікі не толькі атрымлівалі веды, а і захоўвалі сваё здароўе, — адзначае Алена Пархімчык. — Праводзіцца кантроль харчблокаў: наколькі эфектыўна працуюць абсталяванне, вентыляцыйная сістэма, наяўнасць дастатковай колькасці сталоў, крэслаў, посуду, тэхналагічнага і халадзільнага абсталявання».

Дэпутат падкрэслівае, што ў ходзе маніторынгу праблемных момантаў не было выяўлена. Шчыльнае ўзаемадзеянне навучальных устаноў з раённымі органамі ўлады дазваляе не чакаць падрыхтоўчых мерапрыемстваў да новага навучальнага года, а вырашаць праблемы па меры іх паступлення.

Падчас маніторынгу коштаў і асартыменту школьнай формы ў адным з гандлёвых цэнтраў Кобрына **член Савета Рэспублікі Аляксандр ПІШЧ** быў здзіўлены разнастайнасцю швейных вырабаў для дзяцей школьнага ўзросту, а таксама невысокімі цэнамі на іх.

«У адной краме можна набыць як абутак і адзенне для школьнікаў, так і канцылярскія прыналежнасці, — заўважыў сенатар. — Да таго ж тут рэгулярна праводзяць акцыі, аб'яўляюць зніжкі».

Для параўнання Аляксандр Пішч наведаў сельскую краму ў вёсцы Верхалессе, у якой, па словах парламентарыя, прапануецца шырокі асартымент харчовых і нехарчовых тавараў. Безумоўна, ёсць тут і школьны асартымент. «Вельмі важна, каб і ў сельскай мясцовасці людзі мелі магчымасць рабіць для сябе неабходныя пакупкі, не выязджаючы для гэтага ў горад», — адзначыў сенатар.

### НЯДОРАГА, ВЫГАДНА І ЗРУЧНА

**Член Савета Рэспублікі Ігар СЯРГЕЕЎ** правёў маніторынг цэн і асартыменту школьнага адзення ў Касцюковіцкім раёне. Сенатар падкрэсліў, што пытанне забеспячэння навучэнцаў школьным адзеннем і канцылярскімі прыладамі застаецца актуальным для бацькоў і іх дзяцей.

«На парозе — новы навучальны год, і школьнікі павінны быць цалкам падрыхтаваны да навучальнага працэсу, — лічыць парламентарый. — Асартымент тавараў і іх цэнавы дыяпазон вар'іруецца ў залежнасці ад вытворцаў, складу і ўзроставай катэгорыі. У наяўнасці ёсць усё: штаны і пінжакі, спадніцы і жакеты, сукенкі, сарафаны, камізэлькі. На леташнія мадэлі прадугледжаны зніжкі. Немалаважна, што вытворцы ўлічваюць каляровую гаму: чорны ці цёмна-сіні колер у залежнасці ад запыту ўстаноў адукацыі».

Па назіранні сенатара, пакупнікі аддаюць перавагу школьнаму адзенню з натуральных тканін беларускай вытворчасці. «На тэрыторыі раёна можна падрыхтаваць дзяцей да школы без неабходнасці выезду ў абласны цэнтр», — лічыць Ігар Сяргееў.

Чарговы маніторынг цэн і асартыменту школьных тавараў у родным Гомелі правяла **дэпутат па Гомельскай-Прамысловай акрузе № 35 Анжэліна СЫРАМЯТНІКАВА.** Парламентарый нагадала, што галоўная мэта такой ініцыятывы — стварыць умовы для таго, каб кожнае дзіця мела магчымасць атрымаць базавы школьны набор і з радасцю пачаць навучальны год незалежна ад фінансавага становішча сям'і.

«Патрабаванні да школьнай формы на 2025 год засталіся ранейшымі: дзелавы стыль, спакойныя колеры і адпаведнасць узросту вучняў, — праінфармавала дэпутат. — Па выніках маніторынгу ў найбуйнейшым гандлёвым цэнтры Гомеля «Мандарын Плаза» магу ўпэўнена сказаць, што вытворцы значна прасунуліся наперад, прапаноўваючы сучасную і зручную форму. Кошты на адзенне вар'іруюцца ў залежнасці ад брэндаў, матэрыялаў і ўзроставых груп. Пры гэтым прадаўцы адзначаюць, што менавіта цана адыгрывае вырашальную ролю пры выбары пакупнікоў».

Набываючы школьны партфель першакласніку для ўдзелу ў акцыі «Збяром партфель школьніку», парламентарый удакладніла кошты на ранцы і іх змесціва. Так, кошт партфеля вар'іруецца ад 30 да 150 рублёў. Сярэдні чэк за змесціва паводле абавязковага пераліку — 70—130 рублёў.

«Цяпер у навучэнцаў і іх бацькоў ёсць магчымасць набыць усё неабходнае да школы ў адным месцы, каб сэканоміць час і сілы на пошукі, — зрабіла ў выніку маніторынгу і зносін з пакупнікамі выснову Анжэліна Сырамятнікава. — У нашым горадзе працуюць школьныя кірмашы на Цэнтральным рынку, у мінулую нядзелю адбыўся вялікі школьны кірмаш побач з супермаркетам «Алмі», асаблівасцю якога стала рэалізацыя тавараў наўпрост ад вытворцаў без пасярэднікаў».

Дэпутат мае намер і далей сачыць за сітуацыяй з цэнамі і асартыментам, садзейнічаць развіццю любых разумных ініцыятыў, накіраваных на тое, каб зрабіць працэс падрыхтоўкі да школы даступным, зручным і выгадным для ўсіх катэгорый сем'яў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота дадзена героямі публікацый.**






ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Собственник имущества** | ООО «Борисовский завод двигателей «Джили», УНП 690667827, Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, дом 95, пом. 903, часть кап. строения |
| **Продавец** | Ликвидатор ООО «ДЖАСТАС», УНП 591029172, Гродненская обл., г. Гродно, пр. Купалы Янки, д. 87, оф. 614 |

**Второй повторный электронный аукцион в процессе ликвидации. Ранее опубликованное извещение о проведении электронного аукциона в газете «Звязда» № 150 (30538) от 07.08.2025, стр. 7**

**Предмет электронного аукциона**

| Лот, № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|
| 1 | Сборочная линия на базе автоматизированного конвейера (в состав входит: спутник спуска для конвейера, стенд сборки двигателя с коробкой передач), инв. № 17130 | 23 410,84 |
| 2 | Стенд пусковых испытаний двигателя (в состав входит: горячий стенд пусковых испытаний двигателя, тележка для зоны ремонта), инв. № 17131 | 83 460,28 |
| 3 | Автоматизированный испытательный комплекс на базе стенда пусковых испытаний двигателя (в состав входит: тележка для испытания двигателя, электрическая таль), инв. № 17125 | 5 918,04 |
| 4 | Сборочная линия на базе автоматизированного конвейера (в состав входит: производственный конвейер для сборки, спутник для конвейера, роботизированная тележка для транспортировки двигателей, стенд подборки выпускного коллектора, стенд сборки коробки передач, передвижной стеллаж для выхлопного коллектора, трехуровневый стол для инструмента, компрессор), инв. № 17126 | 51 349,86 |

**Задаток 10 %** от начальной цены электронного аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота

**Условия участия и порядок проведения электронного аукциона размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by**

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения электронного аукциона

**Условия оплаты предмета электронного аукциона: не позднее 3 (трех) рабочих дней** со дня подписания договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Электронный аукцион проводится в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель электронного аукциона либо единственный участник электронного аукциона, согласившийся повысить начальную цену предмета электронного аукциона на 5 %, обязан возместить организатору электронного аукциона затраты на их проведение и оплатить оператору ЭТП вознаграждение в размере **3 % в зависимости от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения электронного аукциона**

Организатор электронного аукциона имеет право снять предмет электронного аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:** 08.09.2025, начало электронного аукциона: 10.00, окончание электронного аукциона: 16.00, электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются **с 27.08.2025 по 05.09.2025 г. до 15.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
*(Организатор аукциона)*
по поручению **филиала «ПСХ «Наша Нива» ОАО «СЛУЦКИЙ МЯСОКОМБИНАТ»** *(Продавец)*
проводит повторный открытый аукцион

**ПО ПРОДАЖЕ КЛУБА**

**с инв. № 640/С-116292 общ. пл. 238,5 кв. м (составные части и принадлежности: хозпостройка, уборная), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624680801601000253 площадью 0,2419 га (право аренды по 11.04.2075) по адресу: Минская обл., Слуцкий р-н, Бокшицкий с/с, д. Городище, ул. Садовая, 46.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **13 300,02** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 330,00** бел. руб.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию извещения о проведении аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

*Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 18.07.2025.*

Аукцион состоится **15.09.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.09.2025** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

**Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 136-31-11, 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (801795) 76-1-82, (8029) 355-89-02.**

УНП 601067609

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191 021 390, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2 |
| **Продавец** | Копыльское райпо, г. Копыль, пл. Ленина, 21 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**) |
| **Предмет электронного аукциона** | |
| **Магазин 102,6 кв. м** (здание специализированное розничной торговли), инв. № 642/С-42334, составные части: сарай). Адрес: **Минская обл., Копыльский р-н, Бобовнянский с/с, д. Калиновка 2, ул. Советская, 1А** | |
| ***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,1249 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.02.2035) для строительства и обслуживания магазина. Ограничения (обременения) прав на зем. участок: охранные зоны электрической сети (0,0040 га) | |
| **Начальная цена лота с НДС 20 % – 6 000,00 бел. руб.** (снижена на 60 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов:** в течение **30 (тридцати)** дней после подписания договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах** | |
| Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by). Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену | |
| Победитель торгов либо единственный участник, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 8 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение опубликовано в газеет «Звязда» от 31.07.2025 | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 30.09.2025 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие принимаются по 29.09.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** | |
| **Контактные телефоны: +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by** | |

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «АКТИВ ШУЗ», 220028, г. Минск, ул. Маяковского, д. 115, оф. 402 |
| **Предмет электронных торгов № 1:** Здание четырехэтажного производственного корпуса (Здание специализированное для производства текстильных, швейных, меховых и (или) кожаных изделий), инв. номер 110/С-101881, общ. пл. 7849,6 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 29/7. Составные части и принадлежности: навес на бетонных столбах, бетонное крыльцо | **Начальная цена (с НДС 20 %)** – **8 180 900,00 бел. руб.** |
| **Предмет электронных торгов № 2:** Производственный корпус (Здание специализированное иного назначения), инв. номер 110/С-91039, общ. пл. 5746,0 кв. м, по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 29/1. Составные части и принадлежности: бетонный погреб | **Начальная цена (с НДС 20 %)** – **4 200 000,00 бел. руб.** |
| **Сведения по земельным участкам** | |
| **Сведения о земельном участке по предмету электронных торгов № 1:** предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания фабрики общей площадью 2,1072 га. **Сведения о земельном участке по предмету электронных торгов № 2:** предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания производственного корпуса общей площадью 0,4278 га. **После проведения электронных торгов победителю торгов земельный участок, необходимый для обслуживания объекта(ов) недвижимости, будет предоставлен в установленном законодательством порядке в границах согласованных с продавцом на праве в соответствии с действующим законодательством. Договор купли-продажи должен быть заключен с победителем электронных торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней после регистрации прав на земельный участок, необходимый для обслуживания предмета электронных торгов в установленном законодательством порядке* | |
| **Задаток 1 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638 | |
| **Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор купли-продажи Покупателю | |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **2 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов: 29.09.2025 г. с 11.00 до 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов | |
| **Дата и время окончания приема заявок:** заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.09.2025 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by | |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 373 21 33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by** |

ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА!

# ГЭТА ТРЭБА ЖЫВЫМ

У аграгарадку Доўск Рагачоўскага раёна ў юбілейны год Вялікай Перамогі і Год добраўпарадкавання правялі рэканструкцыю памятнага месца каля брацкай магілы. Новае жыццё мемарыял атрымаў дзякуючы грамадзянскай ініцыятыве «Гэта трэба жывым!», якая стала пераможцам адкрытага конкурснага адбору, што праводзіцца Гомельскай абласной асацыяцыяй мясцовых Саветаў дэпутатаў.

Праект аб'яднаў сотні неабыякавых людзей. Дзякуючы іх намаганням і добраахвотным ахвяраванням на суму дзве тысячы рублёў памятнае месца каля брацкай магілы, дзе пахаваны салдаты і афіцэры, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама Герой Савецкага Саюза Пётр Аляксеевіч Данілаў, добраўпарадкавалі і абнавілі, паведамляе gp.by.

Як падкрэсліў **старшыня Рагачоўскага раённага Савета дэпутатаў Уладзімір ФЕАКЦІСТАЎ,** мэта ініцыятывы — не толькі захаваць гістарычную памяць, але і аб'яднаць людзей, натхніць новыя пакаленні праз масавыя патрыятычныя мерапрыемствы.



ВЕСТКІ З МЕСЦАЎ

# МАЁ СЯЛО, ТЫ ПЕСНЯ І ЛЕГЕНДА

## Правядзенне ў жніўні свят вёскі на Расоншчыне стала добрай традыцыяй

Гэта той летні месяц, калі падворкі поўняцца людзьмі. Ужо зладзілі фэсты аграгарадкі Клясціцы і Сяляўшчына. А Янкавічы сабралі аднасяльчан на ўрачыстасць пад паэтычнай назвай «Маё сяло — ты песня і легенда».





Добрае слова аб тутэйшых работніках вёскі і ветэранах працы сказаў **старшыня Расонскага раённага Савета дэпутатаў Генадзь ФЁДАРАЎ.** З яго рук падзяку атрымала старэйшына вёскі Ганна Пазнякова. Само мерапрыемства праводзілася ў актавай зале Янкавіцкага клуба-бібліятэкі (падстрахаваліся на выпадак бясконцых дажджоў), але на тэрыторыі размясціліся атракцыёны і гандаль.

Надвор'е выпала сонечнае і цёплае, быццам спрыяла добразычлівай атмасферы свята. Работнікі ўстановы культуры падзякавалі вяскоўцам за нялёгкую працу на зямлі, успомнілі добрым словам не толькі работнікаў нівы, але і мясцовага лясніцтва, гандлю, медыцыны, ветэранаў працы, маладыя сем'і, якія засталіся жыць і працаваць у вёсцы, тых, хто ўзорна трымае свае дамы і прысядзібныя тэрыторыі, а таксама шматлікіх юбіляраў.

Добрыя словы і пажаданні чаргаваліся з творчымі нумарамі работнікаў клуба-бібліятэкі і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. На высокім узроўні выконваў песні Станіслаў Казлоў, якога ў нас называюць не інакш як залатым голасам Расоншчыны. Радуе, што ён пражывае ў вёсцы Янкавічы. Не засталіся ў пазыцы перад вяскоўцамі і гасцямі свята ўдзельнікі народнага фальклорнага калектыву «Крыніца», які ў сёлетнім сакавіку адзначыў 25-гадовы юбілей з дня прысваення высокага звання «народны». Нязменным кіраўніком гэтага калектыву з'яўляецца Надзея Кавалёва. Прыемна здзівіла прысутных удзельніца «Крыніцы» Любоў Паўлава, якая па-майстэрску выконвала ў песнях бадзёры свіст. Давялося і аўтару гэтых радкоў прамовіць сваё вершаванае слова:

«У любові табе прызнаюся,
Дарагая навекі зямля.
Да цябе ўсёй душою хінуся —
Ты з маленства калыска мая...»

Урачыстая частка свята завяршылася танцамі «падэспань» і «зялёная дуброва». Тут ужо прыйшлося і старшыні райсавета выйсці ў агульны круг тых, хто танцуе. На тэрыторыі клуба-бібліятэкі жыхары і госці вёскі мелі магчымасць пазнаёміцца з кулінарным майстэрствам мясцовых гаспадынь і пакаштаваць сапраўднай юшкі. Вячэрнія мерапрыемствы пад кіраўніцтвам загадчыцы Янкавіцкага клуба-бібліятэкі Алены Хамчаноўскай працягнуліся гульнямі і дыскатэкай. Урачыстасць яшчэ раз паказала, што ў вёсцы жыццё працягваецца, там пануе атмасфера творчасці, адзінства і гонару за сваю малую радзіму.

**Аляксандр МАТОШКА**,
в. Янкавічы, Расонскі раён.

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 11 461. Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2025 года.**

# ШТО Ў КОШЫКУ?

## МАРГ пракаментаваў цэнавую сітуацыю на спажывецкім рынку за ліпень

**У ведамстве канстатавалі працяг паскарэння гадавой інфляцыі: у ліпені прырост індэкса спажывецкіх цэн (ІСЦ) у гадавым выражэнні склаў 7,4 % супраць 7,3 % месяцам раней. Да снежня мінулага года прырост ІСЦ склаўся на ўзроўні 5,6 %, да папярэдняга месяца — 0,2 %.**



Рэгулятар звяртае ўвагу на той факт, што па выніках справаздачнага месяца гадавая інфляцыя ў Беларусі склалася ніжэйшай, чым у Расіі (дзе яна 8,94 %), Казахстане (11,8 %), Кыргызстане (8,8 %).

Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што з усіх краін еўразійскай «пяцёркі» самы нізкі гадавы прырост ІСЦ у Арменіі — 3,4 %. Гэта значыць, наш узровень інфляцыі перадапошні сярод удзельніц ЕАЭС.

Што паўплывала на паскарэнне інфляцыйных працэсаў?

Як адзначаецца ў аналітычнай інфармацыі МАРГ, асноўны ўплыў на паскарэнне гадавой інфляцыі аказала павелічэнне ў параўнанні з папярэднім месяцам укладу тарыфаў на паслугі — на 0,13 працэнтнага пункта да 1,92 %. Уклад на харчовыя тавары скараціўся на 0,05 працэнтнага пункта да 4,39 %, уклад на нехарчовыя тавары — на 0,01 працэнтнага пункта да 1,10 %.

Найбольшы ўклад у гадавую інфляцыю забяспечылі цэны на мяса-малочную прадукцыю, каву і кандытарскія вырабы, плодаагароднінную прадукцыю, прадукцыю грамадскага харчавання, а таксама тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі.

У прыватнасці, у ліпені ў адносінах да папярэдняга месяца адзначаецца павелічэнне індэксаў цэн на малако і малочныя прадукты (на 0,3 %), а таксама мяса і мясапрадукты (на 1 %) з прычыны павышэння адпускных цэн вытворцамі; кандытарскія вырабы (на 1,5 %); яблыкі (на 8,4 %), каву (на 3,6 %), рыбу і рыбапрадукты (на 0,51 %) з прычыны росту цэн імпарту.

Разам з тым варта сказаць і пра тое, што ў ліпені ў адносінах да папярэдняга месяца адзначалася сезоннае зніжэнне індэкса цэн на плодаагароднінную прадукцыю (на 5,3 %). Больш за ўсё патаннелі капуста белакачанная (на 32,7 %), агуркі свежыя (на 26,5 %), памідоры свежыя (на 16,3 %) і бульба (на 5 %).

У МАРГ нагадалі, што ў ліку мер, якія перашкаджаюць росту цэн, дзейнічае сістэма іх рэгулявання на тавары практычна ўсяго спажывецкага кошыка — як айчынныя, так і імпартныя (гэта вядомая пастанова ўрада № 713). Таксама на II паўгоддзе бягучага года прадоўжана магчымасць атрымання сацыяльнай скідкі на пэўныя групы сацыяльна значных тавараў пенсіянерам, інвалідам, бацькам (законным прадстаўнікам), якія выхоўваюць дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, шматдзетным сем'ям, малазабяспечаным слаям насельніцтва ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Не варта скідаць з рахункаў і кантрольную дзейнасць ведамства. Так, за перыяд са студзеня да ліпеня ў сферы кантролю за цэнаўтварэннем МАРГ устаноўлены парушэнні ў 149 суб'ектаў гаспадарання; выдадзена 46 прадпісанняў аб ліквідацыі парушэнняў; прыменены меры адміністрацыйнай адказнасці і прафілактычнага характару ў дачыненні да 242 вінаватых асоб; штрафныя санкцыі па разгледжаных адміністрацыйных справах склалі больш за 255 тысяч рублёў (у тым ліку па матэрыялах мінулых гадоў).

### У тэму

Рост ВУП у Беларусі склаў 1,3 % у студзені — ліпені 2025-га пасля 2,1 % за студзень — чэрвень (з разліку год да года).

— Рост фарміруюць сектары, арыентаваныя на ўнутраны попыт, — адзначаюць аналітыкі Еўразійскага банка развіцця ў сваім штотыднёвым макрааглядзе. — Рознічны тавараабарот павялічыўся на 8,6 % (год да года), тавараабарот грамадскага харчавання — на 5,1 %. Устойлівы рост захоўваецца ў будаўніцтве і інвестыцыях (9,9 % і 13,6 % адпаведна).

На думку аналітыкаў, негатыўны ўплыў на дынаміку ВУП аказала зніжэнне выпуску прамысловасці на 0,3 % за студзень — ліпень на фоне скарачэння аб'ёмаў экспарту і росту запасаў гатовай прадукцыі.

— Таксама на 12,7 % знізіўся выпуск у сельскай гаспадарцы, што звязана з больш познімі тэрмінамі ўборкі ўраджаю, — адзначаецца ў аглядзе.

# ДЗЕЙСНЫ ІНСТРУМЕНТ

## Тавараабарот расійскіх удзельнікаў на беларускай біржавой пляцоўцы вырас больш як на чвэрць



**З пачатку года для ўдзелу ў таргах на Беларускай універсальнай таварнай біржы (БУТБ) акрэдытаваліся 442 кампаніі з Расійскай Федэрацыі. Такім чынам, у цяперашні час Расія прадстаўлена на БУТБ 4700 кампаніямі з 79 рэгіёнаў. Пры гэтым біржавыя здзелкі ў студзені — ліпені бягучага года заключалі кампаніі з 60 суб'ектаў Расійскай Федэрацыі, што на 12 больш, чым у аналагічным перыядзе 2024 года. У выніку тавараабарот расійскіх удзельнікаў на беларускай біржавой пляцоўцы вырас больш чым на чвэрць.**

Такія даныя агучыў намеснік начальніка ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці БУТБ Герман Пузырны падчас перагавораў з прадпрыемствамі прамысловага сектара Валагодскай вобласці. Сустрэча прайшла днямі ў цэнтральным офісе біржы ў рамках мерапрыемстваў па актывізацыі біржавога гандлю з гэтым рэгіёнам Расіі.

З улікам складу дэлегацыі асноўная ўвага была аддадзена асаблівасцям дзейнасці на пляцоўках прамысловых і спажывецкіх тавараў БУТБ.

Па словах Германа Пузырнага, цікавасць расійскіх дзелавых колаў да гэтай гандлёвай платформы пастаянна павышаецца, забяспечваючы стабільны прырост аб'ёмаў здзелак.

— За 7 месяцаў 2025 года сума здзелак расійскіх кампаній на біржавой платформе прамысловых і спажывецкіх тавараў павялічылася на 42 %. Прычым звыш 70 % усіх кантрактаў прыйшлося на імпарт з Расіі, што сведчыць аб запатрабаванасці расійскай прадукцыі ў беларускіх спажыўцоў, а таксама аб пашырэнні прымянення біржавога механізму расійскімі вытворцамі ў якасці альтэрнатывы традыцыйным каналам продажу. У сувязі з гэтым разлічваем, што і валагодскія прадпрыемствы стануць больш актыўна карыстацца гэтым інструментам для ўдзелу ў закупках на тэрыторыі Беларусі і трэціх краін, — адзначыў прадстаўнік БУТБ.

# ЭФЕКТЫЎНЫ МЕХАНІЗМ

## У першым паўгоддзі адзначаецца ўмацаванне фінансавай устойлівасці камунальных арганізацый Гродзенскай вобласці



**Пра гэта інфармуе Мінэканомікі са спасылкай на начальніка Гродзенскага аддзела па санацыі і банкруцтве Вольгу Скарупскую, якая пракаментавала вынікі праведзенага аналізу ступені рызыкі наступлення банкруцтва дзяржарганізацый рэгіёна.**

Так, своечасова прынятыя меры аздараўлення дазволілі скараціць колькасць праблемных прадпрыемстваў у прамысловасці (на 10,3 %), гандлі (на 6,5 %), сельскай гаспадарцы (на 4 %) і будаўніцтве (на 3,5 %).

У якасці прыкладу выніковасці такой працы эканамічнае ведамства прыводзіць ААТ «Мастоўскі рамонтны завод»: яго чысты прыбытак у студзені — чэрвені павялічыўся амаль на 30 %.

— Абноўлены механізм узаемадзеяння мясцовых органаў улады і дзяржарганізацый, прадугледжаны заканадаўствам аб урэгуляванні неплацежаздольнасці, даказвае сваю эфектыўнасць, спрыяючы зніжэнню колькасці праблемных арганізацый, захаванню вытворчасці і занятасці, — падкрэсліла прадстаўнік Мінэканомікі.

# ІНКЛЮЗІЯ: РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЎСІХ

## У краіне на ўмовах інтэграванага навучання і выхавання займаецца больш за 70 % дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця

Інклюзія ў адукацыі сёння замацавана як адзін з прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі. Ён вызначае роўны доступ да навучання для ўсіх — з улікам разнастайнасці асаблівых індывідуальных адукацыйных патрэб і індывідуальных магчымасцяў кожнага навучэнца: звычайнага, адоранага, таленавітага і таго, у каго ёсць індывідуальныя патрэбы, якія склаліся з-за пэўнай жыццёвай сітуацыі, стану здароўя і іншых абставін.

### ГЭТА НЕ ІНВАЛІДНАСЦЬ

— У Беларусі налічваецца каля 180 тысяч грамадзян з АПФР, — такую статыстыку агучыла БелТА **кансультант аддзела адаптацыі і інтэграцыі асоб з АПФР Мінадукацыі Людміла МАРДОВІЧ.** — З іх 89,56 % — гэта дзеці з парушэннем мовы. Дзеці з інтэлектуальнай недастатковасцю складаюць 6,36 %. Ёсць дзеці з цяжкасцямі ў навучанні — іх 7,24 %, парушэннямі зроку — 1,38 %, функцый апорна-рухальнага апарату — 1,26 %, слыху — 1 %, расстройствамі аўтыстычнага спектра — 3,07 %, цяжкімі множнымі парушэннямі ў фізічным або псіхічным развіцці — 1,28 %. Пры гэтым, па яе словах, інвалідамі з'яўляюцца 10,2 % дзяцей з АПФР.

— І гэта дае падставы казаць, што асаблівасці псіхафізічнага развіцця — не інваліднасць, — заключыла спецыяліст.

У Беларусі вядзецца Банк даных аб дзецях з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Для чаго гэта робіцца, растлумачыла **дырэктар Інстытута інклюзіўнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка Вера ХІТРУК:**

— Адзіная мэта — аказваць бясплатную карэкцыйна-педагагічную дапамогу. Калі ў нас ёсць неабходныя лічбы, мы разумеем, якую колькасць настаўнікаў-дэфектолагаў павінны падрыхтаваць, дзе яны павінны быць і якім чынам могуць аказаць своечасовую і якасную дапамогу.

І такая дапамога існуе — дзеці атрымліваюць адукацыю на розных узроўнях і ў розных формах. Усё пачынаецца з ранняй комплекснай дапамогі, калі бацькі толькі даведваюцца, што іх дзіця мае свае асаблівасці развіцця.

— Яны могуць звярнуцца ў кабінеты ранняй комплекснай дапамогі, якія размяшчаюцца ў нашых дзяржаўных цэнтрах карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі (ЦКРНіР), — расказала дырэктар інстытута. — Менавіта гэта і з'яўляецца іх першым крокам да адукацыі.

Паводле яе слоў, раннюю комплексную дапамогу могуць атрымаць дзеці да трох гадоў.

— У краіне функцыянуюць 3922 пункты карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Раннюю комплексную дапамогу атрымліваюць 2,7 тысячы дзяцей з АПФР, у краіне на базе ЦКРНіР функцыянуе каля 160 кабінетаў такой дапамогі, — дапаўняе Людміла Мардовіч. — Там дзеці атрымліваюць дапамогу настаўніка-дэфектолага, педагога-псіхолага, спецыялістаў па рэабілітацыі — з імі займаюцца лячэбнай фізкультурай, праводзяць музычныя заняткі. Акрамя таго, педагог-псіхолаг можа працаваць не толькі з дзіцем, але і з бацькамі. Гэта важны этап, калі неабходна зразумець і прыняць, што ў цябе дзіця з асаблівасцямі, і неабходна прыкласці ўсе намаганні, каб дапамагчы яму.



Далей дзеці ідуць у школы. Ёсць магчымасць уладкаваць іх у спецыяльны клас, клас інтэграванага навучання і выхавання. З 2022 года, згодна з Кодэксам аб адукацыі, у Беларусі з'явіліся класы сумеснага навучання і выхавання, у якіх дзеці з АПФР вучацца па агульнаадукацыйных праграмах і атрымліваюць карэкцыйную дапамогу.

## Кампетэнтна

**Штогод каля 1000—1100 маладых людзей з інваліднасцю або з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця атрымліваюць вышэйшую, сярэднюю спецыяльную і прафесійна-тэхнічную адукацыю.**

**Намеснік міністра адукацыі Беларусі Аляксандр КАДЛУБАЙ** лічыць адным з галоўных дасягненняў у сферы інклюзіўнай адукацыі ў нашай краіне комплексную сістэму суправаджэння дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ад нараджэння і да атрымання імі прафесіі. Гэтую сістэму можна назваць трыядай, у якой узаемадзейнічаюць адукацыя, ахова здароўя і сацыяльная абарона. Яна ахоплівае практычна на 100 % спецыяльнай адукацыяй і карэкцыйна-педагагічнай дапамогай усіх выяўленых дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. У Беларусі ва ўстановах адукацыі функцыянуе больш за 4,7 тысячы спецыяльных груп і груп інтэграванага навучання і выхавання, каля 6,2 тысячы спецыяльных класаў і класаў інтэграванага навучання і выхавання, больш за 3,8 тысячы пунктаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі.

— Неабходныя ўмовы для прафесійнага станаўлення і развіцця, сацыялізацыі і інтэграцыі ў грамадства маладых людзей з АПФР ствараюцца і ў каледжах, і ў вышэйшых навучальных установах, — каментуе сітуацыю Аляксандр Кадлубай. — Частка абітурыентаў каледжаў і ўніверсітэтаў, якія навучаліся па праграме спецыяльнай адукацыі ў школе, паступаюць у іх на агульных падставах і атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую адукацыю без стварэння алмысловых умоў, бо ў іх не маюць патрэбы.

Абітурыенты з АПФР, у якіх на руках заключэнне ЦКРНіР з рэкамендацыямі стварэння для іх спецыяльных умоў, альбо тыя, хто мае даведку аб засваенні зместу адукацыйнай праграмы спецыяльнай адукацыі ў школе, а таксама дзеці з інваліднасцю, але з адсутнасцю медыцынскіх супрацьпаказанняў да навучання па атрыманай спецыяльнасці або прысвоенай кваліфікацыі могуць навучацца ў любым з каледжаў або ўніверсітэтаў па абранай спецыяльнасці або кваліфікацыі.

Для маладых людзей з інтэлектуальнай недастатковасцю ў агульнадзяржаўным класіфікатары Рэспублікі Беларусь на ўзроўні прафесійна-тэхнічнай адукацыі вызначана 18 спецыяльнасцяў, якія ўключаюць 40 кваліфікацый.

— Наша сістэма прадугледжвае розныя варыянты атрымання адукацыі і аказання дапамогі дзецям з АПФР, — кажа намеснік міністра. — Гэта могуць быць спецыяльныя дзіцячы сад і школа, школа-інтэрнат, цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі. Гэта можа быць інтэграванае навучанне і выхаванне ў дашкольных установах і школах ці навучанне дома. Дзеці атрымліваюць карэкцыйна-педагагічную дапамогу ў пунктах пры дзіцячых садках і школах.


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ООО «ДИАМЕДИКА»

Организатор торгов: ИП Субботницкий И.В. (УНП 691894209), тел. (8029) 666-91-71.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре ликвидации будут проведены **12.09.2025 г. в 16.00** по адресу: Республика Беларусь, 220100, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н.

| **Продавец: ООО «ДИАМЕДИКА» (УНП 800007950) (Продавец является плательщиком НДС)** | | |
|---|---|---|
| № лота | Наименование предмета торгов | Начальная цена с учетом НДС (20 %), BYN |
| 1 | 1) Изолированное помещение, инв. № 500/D-7025392, площадью 129,3 кв. м (1-й этаж), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 1Н, наименование – помещение неустановленного назначения. 2) Изолированное помещение, инв. № 500/D-7101708, площадью 222 кв. м (1-й этаж и подвал), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Максима Богдановича, д. 70, пом. 2Н, наименование – помещение неустановленного назначения | 499000,00 |
| 2 | Система для эндоскопического исследования ЖКТ: система pH Bravo с принадлежностями, инв. № 5602 б/у | 3317,25 |
| 3 | Доменное имя diamedica.by | 685,50 |
| 4 | Доменное имя gi-capsule.by | 685,50 |
| 5 | Система BIPAP S/T, инв. № 5599 б/у | 814,50 |
| 6 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5589 б/у | 5022,75 |
| 7 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5596 б/у | 3353,40 |
| 8 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, инв. № 5594 б/у | 961,50 |
| 9 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга ManoScanTM, инв. № 5601 б/у | 5827,80 |
| 10 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга уровня pHDigitrapperpH-Z, инв. № 5600 б/у | 3819,00 |
| 11 | Система PillCam для эндоскопической визуализации ЖКТ, система мониторинга уровня pHDigitrapperpH-Z, инв. № 5597 б/у | 3819,00 |
| 12 | Системы вспомогательной искусственной вентиляции легких BiPAP: система BiPAP A 40 | 13538,25 |
| 13 | Имплантат для герниопластики: сетка хирургическая композиционная ULTRAPRO UMS3, Код UMS3 – 18 шт. | 5306,25 |
| 14 | Катетер VersaFlex LPR ZNID12 + 8RFGS9000-16 – 2 шт. | 4772,25 |
| 15 | Система функциональной диагностики желудочно-кишечного тракта с принадлежностями и материалами расходными: система Digitrapper pH-Z выборочной комплектации: рекордер Digitrapper pH-Z | 10054,50 |
| 16 | Набор аксессуаров Bravo pH (стенд для калибровки) | 5211,00 |
| 17 | Набор насосов для системы Bravo, 220 В с аксессуарами (вакуумные пробирки и фильтры Bravo) – 2 шт. | 3103,50 |
| 18 | Пакет Accuview pH (программное обеспечение) | 1335,75 |
| 19 | Рекордер pH Bravo | 26691,75 |
| 20 | Катетеры Manoscan ESO – 2 шт. | 24828,75 |
| 21 | Система PillCam для эндоскопической визуализации желудочно-кишечного тракта с принадлежностями и расходными материалами: станция рабочая Given | 8976,75 |
| 22 | Система эндоскопическая капсульная PillCam® для исследования желудочно-кишечного тракта с принадлежностями в составе: устройство для записи данных Data Recorder Kit с аксессуарами (пояс с футляром для ношения Data Recorder, датчики Data Recorder, набор кабелей); устройство зарядное Data Recorder | 9557,25 |
| **Местонахождение имущества: г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н** | | |

Телефон для ознакомления и осмотра +37529 6669171.

Дополнительные сведения об имуществе, спецификациях и порядке проведения аукциона опубликованы: https://cloud.mail.ru/public/NDXA/8KeNKhRAx

**Для участия в торгах необходимо в срок до 17.00 09.09.2025:**

1) зарегистрироваться и подать заявление на участие в публичных торгах по выбранному лоту и соглашение о задатке по электронной почте 6669171@bk.ru либо по адресу: 220100, г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 70, пом. 1Н;

2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY80 UNBS 3013 0096 6200 7001 3933, в ЗАО «БСБ Банк» г. Минск, BIC – UNBSBY2X, получатель – ИП Субботницкий И.В., УНП 691894209.

Шаг торгов – 5 %, задаток – 5 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов.

Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 4 % от начальной цены предмета торгов в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 календарных дней со дня проведения торгов, но не ранее возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов. Срок оплаты предмета торгов: не позднее 20 рабочих дней со дня проведения торгов.

*Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 26.06.2025, 07.08.2025.*

## ПАДРЫХТОЎКА СПЕЦЫЯЛІСТАЎ

Адзін з ключавых момантаў у сферы інклюзіўнай адукацыі — работа педагогаў з бацькамі.

— Мы павінны рыхтаваць не толькі педагогаў-дэфектолагаў, але і педагогаў-псіхолагаў, педагогаў сацыяльных, якія працуюць з сем'ямі, у тым ліку і з тымі, дзе выхоўваюцца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, — упэўнена Вера Хітрук.

Яна ж праінфармавала, што ў БДПУ з верасня 2023 года пачалася падрыхтоўка настаўнікаў-дэфектолагаў па спецыяльнасці «Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя» з шасцю прафілізацыямі, у тым ліку — «Псіхолага-педагагічнае суправаджэнне асоб з РАС». У магістратуры па спецыяльнасці «Інклюзіўная адукацыя» таксама ёсць прафілізацыі «Дзейнасць псіхолага-медыка-псіхалагічнай камісіі ў сучасных умовах», «Ранняя комплексная дапамога дзецям з асаблівымі адукацыйнымі патрэбамі», «Псіхолага-педагагічная падтрымка навучэнцам з РАС» , «Спецыяльная псіхалогія».

## ПРАФЕСІЙНАЯ АДУКАЦЫЯ ЯК ЧАСТКА ІНКЛЮЗІІ

Многіх бацькоў асаблівых дзяцей хвалюе іх далейшы, пасля школы, шлях у адукацыі. Людміла Мардовіч сцвярджае, што ў дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця пасля заканчэння школы ёсць усе магчымасці, каб атрымаць прафесію:

— Усё залежыць толькі ад стану здароўя. Кожны абітурыент праходзіць медыцынскую камісію, а маладыя людзі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця атрымліваюць яшчэ і заключэнне медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі (МРЭК), дзе вызначаецца пералік прафесій, якія яны могуць асвоіць. Адсюль і трэба адштурхоўвацца.

Яна дадала, што Кодэксам аб адукацыі зацверджана права на сацыяльную стыпендыю, якая прызначаецца тым, хто атрымлівае прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю. Даецца таксама магчымасць пражывання ў інтэрнатах, а плата за карыстанне жылым памяшканнем не спаганяецца з дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў I і II груп.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# КАБ І СМАЧНА, І КАРЫСНА

**Арганізацыя харчавання для 41 % школьнікаў будзе ажыццяўляцца ўласнымі сіламі. Трэба заўважыць, што сіл гэтых у бягучым годзе ддасца: у школьныя харчблокі прыйдуць 107 маладых спецыялістаў — 95 кухараў, пяць кандытараў, бухгалтары і іншыя спецыялісты.**



## ЗМЕН НЕ БУДЗЕ, РАЗНАСТАЙНАСЦІ ДАБАВІЦЦА

— Кардынальных змен сёлета годзе ў арганізацыі школьнага харчавання не плануецца, — кажа **начальнік аддзела па арганізацыі харчавання Акадэміі адукацыі Люцыя МІХАЛЬЧУК.** — Пілотны праект прайшоў у 2024 годзе, і быў паспяховы.

Па словах спецыяліста, у рацыёнае харчаванне дзяцей сёння ўключаюцца апрабаваныя ў ходзе праекта і запатрабаваныя навучэнцамі стравы. Усе яны сабраны ў інфармацыйным зборніку тэхналагічных карт страў, які размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі і органаў кіравання адукацыяй у адкрытым доступе.

— Новыя прынцыпы школьнага харчавання мы ўвялі дзякуючы аптымізацыі вытворчага працэсу, — расказвае прадстаўнік Акадэміі адукацыі. — Адкарэкціравалі графікі, пераасначцілі школьныя сталовыя, напоўнілі іх сучасным абсталяваннем. Пры гатаванні сёння прымяняюцца новыя тэхналагічныя рашэнні, а цеснае ўзаемадзеянне з прадпрыемствамі перапрацоўчай прамысловасці дазваляе выкарыстоўваць іх прадукцыю, прызначаную для дзіцячага харчавання.

## ПАРАДАК ВЫЗНАЧАЕ ЗАКОН

У аснове арганізацыі школьнага харчавання ляжаць нарматыўныя прававыя акты, якія вызначаюць парадак прадастаўлення харчавання, у тым ліку бясплатнага, нормы харчавання, грашовыя нормы выдаткаў і іншае.

— Да пачатку навучальнага года мы актуалізуем метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі, — гаворыць начальнік аддзела Акадэміі. — Там, акрамя нарматыўна-прававых актаў, ёсць вялікі пералік дакументаў і патрабаванняў да аб'ектаў грамадскага харчавання, якія размешчаны ва ўстановах адукацыі, асаблівасці арганізацыі харчавання навучэнцаў і тэхналагічнага працэсу пры выкарыстанні сучаснага абсталявання. Акцэнт зроблены на абавязковасці выканання санітарных патрабаванняў як неабходнай умовы якасці бяспекі харчавання дзяцей.

## ПЛАТНАЕ І БЯСПЛАТНАЕ

Сёлета, як і раней, бясплатнае школьнае харчаванне атрымаюць дзеці з малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў, навучэнцы V—XI класаў, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, навучэнцы спецыялізаваных класаў па спорце і шэраг іншых катэгорый. Плануецца, што гэтай льготай будзе ахоплена больш як 65 % школьнікаў.

— Хачу адзначыць, што льгота даецца толькі па адной з падстаў, — канкрэтызуе Люцыя Міхальчук. — Харчаванне астатніх дзяцей будуць аплачваць іх бацькі. І яшчэ адзначу, што бацькі кампенсуюць толькі кошт прадуктаў. Што датычыцца кошту самога харчавання, то на сёння ён застаецца пакуль такім жа, якім быў у мінулым навучальным годзе.

## ДЗІЦЯ ПАВІННА БЫЦЬ ЗДАРОВЫМ І НАКОРМЛЕНЫМ

Адно з пытанняў, якое часцей за ўсё задаюць бацькі: «Ці абавязкова, каб дзіця харчавалася ў школе, і ці будуць наступствы ў выпадку адмовы ад харчавання?»

Спецыяліст Акадэміі адукацыі адказала, што абавязковасць школьнага харчавання ніякімі нарматыўнымі актамі не ўстаноўлена.

— У дзяцей і бацькоў ёсць права адмовіцца ад яго, ніякіх дакументаў не патрабуецца, дастаткова вуснага звароту да кіраўніцтва школы ці гімназіі аб тым, што дзіця ў школе есці не будзе, — удакладніла яна.

Але адказнасць за здароўе дзяцей ляжыць, у першую чаргу, на бацьках. Старшакласнік у школе знаходзіцца доўгі час, і яму абавязкова патрэбна паесці. Смакаты з буфета арганізму, які расце, будзе відавочна недастаткова.

— У нашых школах харчаванне — рацыянальнае, збалансаванае і адпаведнае энергазатратам дзяцей, узроставыя катэгорыі якіх на сённяшні момант дзеляцца на 6—10 і 11—18 гадоў, — тлумачыць Люцыя Міхальчук. — І меню распрацоўваецца адпаведнае. Таму бацькам трэба памятаць, што іх дзіця павінна быць і накормленым, і здаровым.

## ДЗЕВЯЦЬ НОВЫХ СТРАЎ

Дарэчы, у школьнае меню ў надыходзячым навучальным годзе дададуцца новыя стравы. Іх назвы агучыла **дырэктар Дзяржаўнага прадпрыемства «Камбінат школьнага харчавання г. Мінска» Людміла КРУПСКАЯ.**

— Мы парадуем дзетак мяснымі шарыкамі, салатамі «Выдатны», «Школьная мазаіка», «Фасолька» і «Раніца». З гарачых страў — гуляш «Пікантны», мякаць курынага сцягна ў смятанна-таматным соусе, суп «Мінскі» і напой «Яблычны», — пералічыла яна. — Усё вельмі смачна, а галоўнае — карысна.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

**Дарэчы**

# ДА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА ГАТОВЫ

## Усе беларускія школы атрымалі пашпарты гатоўнасці

— Падпісаны ўсе пашпарты гатоўнасці нашых школ да новага навучальнага года, — паведаміў **міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ.** — Гаворка не ідзе аб тым, што абсалютна ўсе работы па прывядзенні ў парадак аб'ектаў, якія, у тым ліку, рэалізоўваюцца па зводным плане капітальных рамонтаў школ, скончаны. Гаворка пра тое, што тыя неабходныя ўмовы, якія прад'яўляюцца ў частцы бяспекі школьнікаў трыма ведамствамі краіны — міністэрствамі ўнутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях і аховы здароўя, — выкананы.

Ён таксама адзначыў, што адукацыйнае ведамства чакае актаў уводу ў эксплуатацыю ўстаноў адукацыі — новабудоўляў, якіх сёлета сем.

**Паводле БелТА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации»** (организатор аукциона) по поручению филиала **«Автобусный парк № 2» ОАО «Миноблавтотранс»** (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: **административный корпус,**

**инв. № 640/С-61959 общей площадью 1 447,8 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,3485 га с кадастровым номером 624650100001008353** (право постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 1.**

**Условия продажи:**

1. Улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества.
2. Поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели).
3. Обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости.
4. Разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством.
5. Проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета.
6. Использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством.
7. Запрет на увеличение существующей санитарно-защитной зоны в виду расположенной рядом индивидуальной жилой застройки.
8. Запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Начальная цена с НДС (20 %) – 50,40 бел. руб.**
***Цена равна 1 (одной) базовой величине.*** **Задаток – 50,40 бел. руб.**

Лот № 2: **здание пожарного депо**

**с инв. № 640/С-62637 общ. пл. 236,6 кв. м (составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, покрытие из бетона), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001010236 (право аренды по 21.11.2033) пл. 0,0815 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Транспортная, 1Г.**

На земельном участке имеются ограничения прав в использовании: санитарная зона охраны источников питьевого водоснабжения (0,0815 га).

Начальная цена с НДС (20 %) – **46 973,54** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **4 697,00** бел. руб. **Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона по лоту № 1 возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение результативного аукциона, по лоту № 2 оплачивает вознаграждение в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения по лоту № 1 опубликованы в газете «Звязда» от 26.04.2018, 10.10.2018, 15.10.2019, 27.06.2020, 01.12.2020, 18.10.2022, 06.10.2023, 03.09.2024, 17.05.2025, по лоту № 2 – от 20.07.2024, 11.12.2024.*

Аукцион состоится **08.09.2025** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.09.2025** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**
**Тел. для осмотра: (801795) 4-54-28, (8029) 358-56-32.**

УНН 601070249

# СТАЛІЦА ГАСЦІННАСЦІ

## Колькасць замежных турыстаў у Мінску — самая высокая за апошняе дзесяцігоддзе

Вясенне-летні турыстычны сезон завяршаецца з рэкорднымі паказчыкамі для гасцінічнага бізнесу сталіцы. Загрузка атэляў наблізілася да 70 %, а колькасць замежных турыстаў стала самай высокай за апошняе дзесяцігоддзе. Аб гэтым, а таксама аб планах і перспектывах даведаліся падрабязна.

### БОЛЬШ ЗА ПАЛОВУ ЭКСПАРТУ ТУРПАСЛУГ

Сёння Мінск усё больш упэўнена замацоўваецца на карце буйных турыстычных цэнтраў Еўропы. У горадзе са шматвяковай гісторыяй і ўнікальнай архітэктурай дзейнічаюць 57 гасцініц і 14 аналагічных сродкаў размяшчэння на звыш чым 12,5 тысячы месцаў. І сфера гасціннасці горада працягвае развівацца, што падкрэслівае **дырэктар інфармацыйна-турысцкага цэнтра «Мінск» Аляксей РУСАКЕВІЧ:**

— Створаная сучасная інфраструктура дазваляе забяспечыць прыём і камфортнае размяшчэнне як індывідуальных турыстаў, так і турыстычных груп. У тым ліку — удзельнікаў значных мерапрыемстваў нацыянальнага і міжнароднага ўзроўняў, спартыўных форумаў, культурных і канцэртных тураў. Сёлета за перыяд студзень — ліпень сярэдняя загрузка гасцініц горада склала 67,2 %, што на 7,4 % вышэй за аналагічны перыяд мінулага года.

Сёння на Мінск прыпадае больш за палову — 57 % — усяго экспарту турпаслуг краіны. Па выніках 2024 года сталіцу наведала больш за 400 тысяч арганізаваных турыстаў і экскурсантаў — гэта амаль на трэць больш, чым годам раней. Прычым попыт на пражыванне ў сталічных гасцініцах — як дзяржаўных, так і прыватных, — у першую чаргу забяспечваюць замежныя турысты. Іх доля традыцыйна перавышае 70 %. Больш за ўсё прыязджаюць з Расіі, Кітая, Латвіі, Літвы і Узбекістана, чым забяспечваюць асноўную загрузку атэляў і дапамагаюць сталіцы замацаваць імідж горада, адкрытага для гасцей з усяго свету.

### ПРЫЕЗДЖЫМ НА ЗАМЕТКУ

Штогод у Мінску праводзіцца больш за 500 мерапрыемстваў розных узроўняў і кірункаў. Напрыклад, даўно сталі добрай традыцыяй гастранамічныя фэсты, кірмашы і вулічныя пікнікі. Больш за шэсць тысяч устаноў грамадскага харчавання працуе на пастаяннай аснове, каля двухсот спецыялізуецца на беларускай кухні. А з мая па верасень сталіца жыве ў рытме летняга музычна-турыстычнага сезона. У гэтым годзе галоўнай яго тэмай стала 80-годдзе Вялікай Перамогі. Таксама ў маі быў адкрыты Мінскі міжнародны выставачны цэнтр BELEXPO — першы і адзіны такога маштабу ў Беларусі, які садзейнічае развіццю дзелавога турызму сталіцы. За апошнія гады з'явіліся і новыя аб'екты спартыўнага турызму — басейн міжнароднага стандарту і Нацыянальны футбольны стадыён.




Дарэчы, усё больш гасцей Мінска выбіраюць актыўны адпачынак на свежым паветры, а таму ў кожным раёне пракладзены веласіпедныя і пешаходныя маршруты, аб'яднаныя ў адзіны сталічны. Зялёныя зоны займаюць звыш 42 % тэрыторыі горада. Былі створаны 24 экасцежкі, для зручнасці турыстаў распрацаваны аўдыягіды і інфармацыйныя стэнды. Адкрыццём для многіх можа стаць і тое, што сёння 24 прадпрыемствы Мінска адкрыты для наведвання. Прайсціся па цэхах і выставачных павільёнах, убачыць, як нараджаецца прадукцыя беларускіх брэндаў, вядомых далёка за межамі краіны, можа кожны ахвочы. У найбліжэйшыя гады спіс такіх прадпрыемстваў будзе толькі пашырацца.




### ЗОРКІ НА БЕРАЗЕ СВІСЛАЧЫ

**Апошнія два гады ў Мінску праходзяць маштабныя рэнавацыі: падтрымка ўлады ў выглядзе зніжэння маёмасных падаткаў дазволіла абнавіць шэраг атэляў. Увесну, напрыклад, завяршыліся работы ў будынках атэляў «Вікторыя», у «Еўропе» асвяжылі нумары, адміністрацыйныя памяшканні і перагаворны пакой. Наперадзе чакаюць рамонту фасады «Еўропы» і сеткі атэляў «Time». На 2026-ы ўжо запланаваны комплекс будаўніча-мантажных работ гасцініцы «На Замкавай».**

Нагадаем, што за апошнія тры гады ў горадзе адкрыліся новыя атэлі. Спачатку на вуліцах Рэвалюцыйнай, Зыбіцкай і скрыжаванні вуліц Багдановіча і Купалы, затым — на беразе вадасховішча Дразды. Летась гасцінічная сетка папоўнілася яшчэ і апарт-атэлем на вуліцы Шчарбакова. Але і гэта не ўсё — найбуйнейшае адкрыццё чакаецца ў самым цэнтры сталіцы. Тут, на месцы былога выставачнага комплексу «БелЭкспа», хутка адкрыецца шыкоўны атэль «Waldorf Astoria Minsk» сеткі «Hilton». Тым часам, у Лошыцкім парку пад утульную трохзорkавую гасцініцу быў рэканструяваны адзін з карпусоў комплексу гістарычных будынкаў, і работы працягваюцца.

Мэты, пастаўленыя на бліжэйшыя гады, уражваюць: прыцягненне большай колькасці ўнутраных турыстаў з дапамогай гнуткай цэнавай палітыкі і арганізаваных мерапрыемстваў, пастаяннае павышэнне якасці абслугоўвання, навучанне персаналу. Да таго ж, вядзецца распрацоўка і запуск новых айчынных лічбавых прадуктаў для кіравання гасцінічным бізнесам. Аб'яднаннем «Сталічны гандаль і паслугі» праводзіцца работы па стварэнні аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Адзіная платформа гасцінічных комплексаў», якая замесціць існуючыя ў прадпрыемствах праграмныя модулі і сістэмы імпартнай вытворчасці.

**Аміна НАЗАРАВА.**


**ООО «Деловая оценка»** (организатор аукциона) по поручению **Добрушского РайПО** (продавец) извещает о проведении **9 сентября 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

**Лот № 1:** Капитальное строение с инв. № 311/С-51601 общей площадью 344,0 кв. м, наименование – Магазин № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание магазина, с надворными постройками: складом, уборной. Капитальное строение с инв. № 311/С-51602 общей площадью 56,0 кв. м, наименование – Склад, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание склада

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321282808301000125 площадью 0,1576 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, д. Хорошевка, ул. Юбилейная, 1А

**Начальная цена** продажи с НДС – 15 948,00 бел. руб.
**Задаток** – 159,48 бел. руб.

**Лот № 2:** Капитальное строение с инв. № 311/С-52024 общей площадью 141,9 кв. м, наименование – Магазин № 14, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой и котельной здание магазина. Капитальное строение с инв. № 311/С-52023 общей площадью 17,1 кв. м, наименование – Гараж, назначение – Здание специализированное транспорта, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание гаража. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 321284803901000149 площадью 0,0430 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Ленинский с/с, аг. Красный Партизан, ул. Краснопартизанская, 1

**Начальная цена** продажи с НДС – 7 862,40 бел. руб.
**Задаток** – 78,62 бел. руб.

**Лот № 3:** Капитальное строение с инв. № 311/С-50662 общей площадью 262,7 кв. м, наименование – Магазин № 41, назначение – Здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: Одноэтажное кирпичное с кирпичной пристройкой здание магазина с надворными постройками: навесом, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000786 площадью 0,1050 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 2. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 17 215,20 бел. руб.
**Задаток** – 172,15 бел. руб.

**Лот № 5:** Капитальное строение с инв. № 311/С-50661 общей площадью 216,0 кв. м, наименование – Кафе-кулинария, назначение – Здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321282804101000454 площадью 0,0659 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Кормянский с/с, аг. Корма, ул. Комсомольская, 1. Лот включает оборудование в количестве 8 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 11 628,00 бел. руб.
**Задаток** – 116,28 бел. руб.

**Лот № 6:** Капитальное строение с инв. № 311/С-51318 общей площадью 64,6 кв. м, наименование – Магазин № 18, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное кирпичное здание с надворными постройками: сараем, уборной, двумя крыльцами, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100003001592 площадью 0,0316 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Крылова. Лот включает оборудование в количестве 5 ед. Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 14 527,44 бел. руб.
**Задаток** – 145,27 бел. руб.

**Лот № 7:** Капитальное строение общей площадью 124,7 кв. м, наименование – Здание магазина, назначение – Нет сведений, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321275703601000472 площадью 0,0752 га по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Тереховский с/с, г. п. Тереховка, ул. В. И. Ленина

Лот включает оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

**Начальная цена** продажи с НДС – 24 408,00 бел. руб.
**Задаток** – 244,08 бел. руб.

**Лот № 8:** СОТ Кореневка (Торговый пав.), инв. № 1355/474, Морозильник ММ 163, инв. № 247/3321, Холодильник торг., инв. № 1518/492, Сигнализация пож., инв. № Хза304, Сигнализация охр., инв. № Хза87, ТОРГОВОЕ ОБОР. (Прилавок), 2 шт., инв. № Хза89, ТОР. ОБОР. (Стеллажи), 3 шт., инв. № 1356/474. Заключен договор аренды от 27.05.2025 г. № б/н

**Начальная цена** продажи с НДС – 2 154,96 бел. руб.
**Задаток** – 21,55 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

**Продавец: Добрушское РайПО**, г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47. Конт. тел.: +375 232 34-98-92, +375 44 590-84-01.

**Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030 226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 08.09.2025 г. в 17.00.**

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.**

# БЕЛАРУСКАЕ ПІСЬМЕНСТВА Ў ЛІДЗЕ: СВЯТА З ТРАДЫЦЫЯМІ

## Выдавецкі дом «Звязда» рыхтуе да яго сюрпрызы і падарункі

Калі Францыск Скарына выдаў свой «Апостал» у Вільні ў 1525 годзе, то кніга магла патрапіць у Ліду. Горад на той час ужо быў уключаны ў актыўныя гандлёвыя шляхі і меў кантакты з тагачаснай Вільняй. Кніга, як бы цяпер сказалі, была прызначана для шырокага кола чытачоў. У прынцыпе Скарына і думаў пра людзей, якім нёс святло веры і асветы...

І вось праз 500 гадоў мы згадваем пра адно з адметных выданняў нашага першадрукара, у тым ліку падчас Дня беларускага пісьменства, што пройдзе ў Лідзе 6 і 7 верасня. Гэта не адзіная адметная дата, якая надае сёлетняму святу асаблівы сэнс, бо літаратараў і кнігавыдаўцоў асабліва натхняе 80-годдзе Перамогі. У Лідзе прадставяць кнігі самага рознага зместу для аўдыторыі з рознымі зацікаўленасцямі.

Кожны горад, куды прыязджае свята, дадае яму сваю аўру. Лідскі замак — як напамін пра тую старажытнасць, дзе былі ў тым ліку вытокі нашай дзяржаўнасці. Варта чакаць, што ўрачыстасці, якія традыцыйна адбываюцца падчас свята, будуць прасякнуты гісторыяй Лідскага краю — з ёю нават збіраюцца пазнаёміць гасцей, арганізаваўшы адмысловы турыстычны тур, каб наведаць найбольш адметныя мясціны раёна. Яшчэ гістарычны акцэнт — інтэлектуальныя «Лідскія чытанні», таму што важна злучыць гісторыю з цяперашнім часам. Што ўжо раз-важаць пра тое, з якім настроем сёлета будуць атрымліваць свае ўзнагароды лаўрэаты Нацыянальнай літаратурнай прэміі, імёны якіх звычайна называюць перад шырокай аўдыторыяй. Фестываль кнігі і прэсы — таксама вельмі жывая традыцыя, бо калі свята асветы едзе ў горад, то кніга як найбольш яркі яго сімвал павінна ісці «ў народ». То-бок усе кніжныя навінкі айчынных выдавецтваў, а таксама выданні, што прымеркаваны непасрэдна да Дня беларускага пісьменства, павінны быць прадстаўлены.

З чым збіраецца ў Ліду «Выдавецкі дом «Звязда», расказвае **намеснік дырэктара Святлана ГАНЦАРЭВІЧ:**

— Адмыслова для сёлетняга свята беларускага пісьменства мы падрыхтавалі дзіцячую кнігу «З Міхасём і Міхалінкай крочым роднымі сцяжынкамі». Выданне адметнае тым, што знаёміць з гісторыяй Лідскага краю, яе славутасцямі і асаблівасцямі сучаснага жыцця. Дзеці вучацца разумець сваю малую радзіму праз ілюстрацыі і фотаздымкі, віктарыны, крыжаванкі, размалёўкі... Кожны першакласнік Лідчыны атрымае гэту кнігу ад нас у падарунак. Але ў «Выдавецкага дома «Звязда» наогул каля 400 кніг для дзяцей і для дарослых — багаты выбар на любы інтарэс і густ: ад мастацкіх да грамадска-палітычных як выданне «Время выбрало», якое выйшла тыражом у 5000 экзэмпляраў. Вядома, прадставіць усю палітру прадукцыі ў Лідзе будзе складана, але на стэндзе «Выдавецкага дома «Звязда» можна будзе пазнаёміцца з найбольш адметнымі і папулярнымі кнігамі, набыць іх у сваю бібліятэку як падарункі для дарослых і дзяцей. Дарэчы, у нас ёсць серыя «Школьная бібліятэка класікі». Гэта кнігі, якія раяць для пазакласнага чытання вучням другога, трэцяга і чацвёртага класаў. Яны вельмі актуальныя на пачатку навучальнага года, што ацэняць клапатлівыя бацькі. Вядома, падчас свята кожнае выдавецтва імкнецца прыцягнуць увагу да сваёй прадукцыі праз прэзентацыі. У нас прадстаўляць кнігі будуць самі аўтары, пісьменнікі, якія прыедуць з розных рэгіёнаў Беларусі, каб узяць удзел у падзеях свята: Міхась Пазнякоў, Кацярына Хадасевіч-Лісавая, Ірына Карнаухава — з Мінска, Людміла Кебіч — з Гродна, Таццяна Дзямідовіч — з Брэста і іншыя... І гэта добрая магчымасць разам з кнігай атрымаць аўтограф аўтара. Мы разумеем: важна не толькі мець, што паказаць, але і прыцягнуць людзей і зацікавіць, таму плануем адмысловых акцыі, сувеніры і падарункі найбольш актыўным наведвальнікам. Трэба, каб свята вiравала ў кожным пункце і каля кожнага стэнда. Добра ўсведамляем, што важна наладзіць кантакт з людзьмі, каб кожны, хто да нас завітае, убачыў свята. Адчуваем вялікую адказнасць, таму што Дзень беларускага пісьменства адбываецца ў горадзе з багатымі культурнымі традыцыямі.




**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Профитсистем»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток (10 %), бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1358 | Изолированное помещение с инвентарным номером 601/D-4550 (назначение – Квартира, наименование – Квартира, общая площадь – 50,6 кв. м); Вытяжка кухонная Germes «Честер», инв. № 70030062; Комплект корпусной кухонной мебели (7 шкафов+столешница), инв. № 70030053; Мойка L65848-6R Ledeme + Смеситель для кухни Ledeme L5913-1, инв. № 70030061; Плита газовая бытовая 4-горелочная GEFEST ПГ 1200С5, инв. № 70103003; Раковина «Керамин Верона» 60 + Пьедестал под умывальник + Крепление для умывальника, инв. № 70030063 | 73 332,00 | 7333,20 | 3666,60 |
| 1332 | Кровать одинарная (с матрацем 1992*950*700) РБ (70030031); Кровать одинарная (с матрацем 1992*950*700) РБ (70030034); Кровать одинарная (с матрацем 1992*950*700) РБ (70030035); Кровать одинарная (с матрацем 1992*950*700) РБ (70030036); Кровать одинарная (с матрацем 1992*950*700) РБ (70030037); Скамья угловая «Галант» н/м УЮТ-1 РБ (70030056); Стол из постформинга 1100*700 (Глобо) РБ (70030055); Табурет СН005-012 «Артем-мебель» РБ (70030057); Табурет СН005-012 «Артем-мебель» РБ (70030058); Табурет СН005-012 «Артем-мебель» РБ (70030059); Тумба прикроватная (с нишей 400*404*660) РБ (70030032); Тумба прикроватная (с нишей 400*404*660) РБ (70030041); Тумба прикроватная (с нишей 400*404*660) РБ (70030042); Тумба прикроватная (с нишей 400*404*660) РБ (70030043); Тумба прикроватная (с нишей 400*404*660) РБ (70030044); Холодильник АТЛАНТ МхМ 28276-90 (70102004); Шкаф для платья и белья (958*580*1824) РБ (70030048); Шкаф для платья и белья (958*580*1824) РБ (70030049); Шкаф для платья и белья (958*580*1824) РБ (70030050) | 854,21 | 85,42 | 42,71 |
| 1722 | Токарно-винтор. станок 16К20 | 4452,00 | 445,20 | 222,60 |
| 2051 | Комплект оборудования для производства топливных гранул мощностью 900 тонн/месяц согласно списку № 1: https://orgtorg.by/upload/doc/profitsistem/2051.pdf. | 435 821,88 | 43 582,19 | 21 791,09 |

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. (5 %) | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1783 | Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-610835, площадь – 217,9 кв. м, назначение – Квартира, наименование – Квартира. В состав объекта входит: Котел газовый VAILLIANT VK INT 35/K-1E, Газовый проточный водонагреватель Ariston Superlux DGI 10LCF, Кондиционер LG S09LHP, Кондиционер Tadilux TRM 12, Кондиционер Tadilux TRM 12, козырек. Кондиционер Toshiba (инв. 20084-1); Кондиционер KB 2-2.20 «Энергия» (инв. 20083); Кондиционер DAIKIN (внутренний FTXF35C +наружный RXF35C-блоки сплит-системы) (инв. 70041017); Кондиционер LG (инв. 00005427); Система контроля доступа (инв. 70280); Слаботочная линии связи в адм. пом. ГО (инв. 48013002); Система вентиляционная (инв. 41602018); Система пожарной сигнализации (инв. 50426205); Ограждение с полимерным покрытием; Счетчик холодной воды ETK-м-N с электронным модулем сбора данных PDC LR – (инв. 47063001) | 833 648,93 | 41 682,45 | 41 682,45 |

В отношении лотов №№ 1358, 1332 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 40 % в отношении лота № 1332. Стоимость снижена на 25 % в отношении лота № 1358.**
В отношении лота № 1722 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.**
В отношении лота № 2051 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 35 %.**
В отношении лота № 1783 проводятся седьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 25 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» от 06.08.2025

**Местонахождение лотов №№ 1332, 1358:**
Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, микрорайон «Военный городок», д. 6, кв. 47.
**Местонахождение лотов №№ 1722, 2051:**
Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 3Б.
**Местонахождение лота № 1783:** г. Минск, ул. Достоевского, 27-1

Лот № 1783 расположен на земельном участке с кадастровым номером 500000000008000483, площадь 0,0360 га, назначение – Строительство и обслуживание жилого дома.
Право собственности (залог права ОАО «Приорбанк»)

В отношении частей лота № 2051 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Приорбанк»). Подробная информация по телефону +375293110464 (Анастасия).
Помещение с инв. № 500/D-610835 (лот № 1783) и земельный участок под ним имеет обременение в виде залога ОАО «Приорбанк». В случае продажи объекта на торгах залог прекращается в силу законодательства (ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 № 345-З (ред. от 28.06.2022) «Об ипотеке»).
Объект используется не по назначению на основании решения администрации Советского района г. Минска № 1058 от 22.10.2013 «О согласовании использования не по назначению квартиры в жилом доме»

Изолированное помещение с инв. № 500/D-610835 (лот № 1783) является частью блокированного двухэтажного здания, имеет отдельный подъезд, собственный земельный участок площадью 0,036 га.
**Помещение пригодно к административному использованию. Для этого соблюдены все технические требования. Необходимые для обслуживания помещения инженерные коммуникации подведены и исправны.**
Имеется центральная канализация. Согласно актуальному генплану здание под снос не подпадает

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **9 сентября 2025 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 27 августа 2025 года до 16.00 5 сентября 2025 года** |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту ___, ООО «Профитсистем», проводимых 09.09.2025.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1783 – 1,5 %, по лоту № 2051 – 4 %, по лоту № 1358 – 6 %, по лоту № 1722 – 9 %, по лоту № 1332 – 10 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней (по лоту № 1783) и в течение 5 (пяти) рабочих дней (по лотам №№ 1332, 1358, 1722, 2051) со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов осуществляется согласно договору купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) календарных дней (по лоту № 1783) и не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней (по лотам №№ 1332, 1358, 1722, 2051) со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов: +375295295202 Сергей (пн-пт с 10.00 до 13.00) – **лоты № 1722, 2051,** +375292751275 Виноградов Дмитрий Алексеевич (пн-пт с 9.00 по 17.00) – **лоты №№ 1332, 1358,** +375293718060 Сергей **– лот № 1783.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Профитсистем», в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375173958917 (220040, г. Минск, ул. Достоевского, 27)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97• e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# СКАНВОРД



Мала-дая ка-рова
Шчып-ковы муз. інст-румент
«Анты-под» ікса
Асвят-ляльны прыбор
Ка-рысць, добры вынік
Фран-цузскі кампа-зітар
Від выяў-ленча-га мас-тацтва
Стужка са здым-камі для паказу
Лісток з пра-паган-дай
Паўноч-ная марская птушка
Мастак На-полеон ...
Захвор-ванне ЖКТ
Пака-ты спуск
Ліст хвой-ных дрэў
Крэ-дытная ўста-нова
Лямпа над ка-напай
Вяроў-ка з пят-лёй на канцы
Гуль-ня, па-цеха
Самка хат-няга сабакі
Месца, дзе па-сецца жывёла
Шчыль-ны слой чаго-н.
Са-шчэпка для бяр-вення
Зеля-ніна ў пус-тыні
Цвёр-ды мі-нерал
Шанца-ванне, поспех
Марс-кі рак
Ка-манда сабаку
Знач-нае ўзвыш-ша
Во-сень-ская кветка
Вокліч пахва-лы, адаб-рэння
На бяз-рыб'і ... рыба
Метрыч-ная му-зычная адзінка

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Цягнік. Люстра. Агітка. Схіл. Іголка. Аркан. Ламбард. Азаіс. Папас. Ату. Краб. Удача. Гара. Брава. Астра. Такт. **Па вертыкалі:** Цёлка. Гуслі. Ігрэк. Фільм. Гагара. Топк. Адан. Скульптура. Орда. Каліт. Бра. Забава. Сука. Пласт. Скаба. Агат. Рак.

Склаў
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# Надвор'е на заўтра

| | | |
|---|---|---|
| **МІНСК** 762 мм рт.сл. | +9..+11°С | +18..+20°С |
| **ВІЦЕБСК** 762 мм рт.сл. | +8..+10°С | +18..+19°С |
| **МАГІЛЁЎ** 762 мм рт.сл. | +8..+10°С | +19..+20°С |
| **ГОМЕЛЬ** 764 мм рт.сл. | +9..+11°С | +21..+22°С |
| **ГРОДНА** 759 мм рт.сл. | +10..+11°С | +20..+24°С |
| **БРЭСТ** 758 мм рт.сл. | +11..+12°С | +24..+28°С |

**Месяц**

*Маладзік 23.08.–30.08. Месяц у сузор'і Шаляў .*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**




Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

Паводле даных Белгідрамета

**...у суседзяў**

| | |
|---|---|
| **МАСКВА** | +18..+19°С |
| **С.-ПЕЦЯРБУРГ** | +16..+18°С |



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**27 ЖНІЎНЯ** Даты Падзеі Людзі

**У краіне**

**1860** год — нарадзіўся Карл Эмерыкавіч Чапскі (Караль Ян Аляксандр) (в. Станькава Дзяржынскага раёна Мінскай вобл.), адзін з прадстаўнікоў старажытнага роду Гутэн-Чапскіх. У 1890—1901 гг. гарадскі галава ў Мінску. Узначальваў многія грамадскія і дзяржаўныя арганізацыі. Адкрыў у Мінску прытулак, шпіталь, амбулаторыю, пусціў электрастанцыю, трамвай, замасціў вуліцы. Садзейнічаў адкрыццю ў Мінску Таварыства аматараў спорту (з 1892-га яго старшыня), Таварыства аховы жанчын, гарадскога крэдытнага таварыства. Быў актыўным членам Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі.

**1880** год — нарадзіўся Аляксандр Трафімавіч Кірсанаў (Расія), беларускі вучоны-аграхімік, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар (1909). У 1913—1925 гг. кіраўнік Мінскай балотнай станцыі (адначасова з 1922 г. рэктар Беларускага інстытута сельскай і лясной гаспадаркі). Вывучаў балотныя масівы Беларусі. Аўтар метаду вызначэння даступнай для раслін формы фосфару ў глебе.

**1930** год — нарадзіўся Аляксандр Міхайлавіч Саржэўскі (Ніжагародская вобл., Расія), беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук (1973), прафесар (1974), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1980). Аўтар навуковых работ па люмінесцэнцыі, квантавай электроніцы і нелінейнай спектраскапіі, праблемах выкладання фізікі ў ВНУ.

**У свеце**

**1845** год — нарадзіўся Фёдар Фёдаравіч Мартэнс, рускі юрыст і дыпламат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1908), заснавальнік міжнароднага гуманітарнага права. Быў адным з аўтараў праграмы Першай Гаагскай канферэнцыі міру, якая заклала асновы раззбраення, правілы вядзення вайны і мірнага вырашэння міжнародных спрэчак.

**1870** год — нарадзіўся Георг Вільгельм Фрыдрых Гегель (1870—1831), нямецкі філосаф, які стварыў на аб'ектыўна-ідэалістычнай аснове сістэматычную тэорыю дыялектыкі.

**1955** год — у Вялікабрытаніі па ініцыятыве піваварнай кампаніі «Гінес» выйшла ў свет першае выданне «Кнігі рэкордаў Гінеса».

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## ТАКІЯ ВОСЬ АМОНІМЫ...

Калі памятаеце са школьнай праграмы, амонімы — гэта словы, якія аднолькава пішуцца і вымаўляюцца, але маюць абсалютна рознае значэнне... Не памятаеце? Дык і мы б век пра тое не згадалі, калі б не кур'ёзны выпадак, з імі звязаны.

Нядаўна ў маёй любімай цётухны быў дзень нараджэння. Жанчына яна ўжо ў гадах, але яшчэ вельмі жвавая і гаспадарлівая. Таму падарункі ёй стараюся рабіць карысныя, а каб ужо дакладна ўгадзіць, заўсёды пытаю, што яна хацела б. Гэтым разам цётка папрасіла сушылку — «такую, як у вас». Сушылку дык сушылку — якраз сезон нарыхтовак, будзе грыбы-яблыкі на зіму сушыць. Цэлы вечар з мужам па інтэрнэт-магазінах лазілі, шукалі прыдатны варыянт. Нарэшце знайшлі — кампактная, але не малая, сучасная, з рознымі электроннымі «прыбамбасамі», толькі што не размаўляе. Забралі мы падарунак з пункту вывазу, яшчэ спецыяльна заехалі ў гандлёвы цэнтр, каб прыгожа нам яго запакавалі.



І вось прыязджаем мы да імяніннніцы ў госці, а там ужо ўсе за сталом сядзяць. Урачыста ўручаем ёй тую закручаную ў бліскучую паперу каробку з каментарыем: маўляў, тое, што заказвала. Цётухна каробку ўзяць узяла, але неяк насцярожана. Я кажу: купілі самую сучасную, нават з таймерам. Імяніннніца на падарунак здзіўлена так паглядзела, пасля з сумненнем спытала: «Нейкая яна малаватая?» Не, кажу, не малаватая, такая ж як у нас — шэсць кругоў. «Якіх кругоў?» — на твары цёткі было ўжо не здзіўленне, а хутчэй спалох. Такіх, кажу, на якіх сушыць. «А, ну ясна», — адказала яна і падарунак так асцярожненька на канапу паставіла. Пасля, нібы рашыўшыся, пачала тую абгортку здымаць...

Далей было ну вельмі смешна. «Вой, дык вы мне для агародніны сушылку купілі?» «Ну так, а ты якую хацела?» «Для бялізны»... Рагаталі мы за сталом цэлы вечар. Дзіва што ў цёткі вочы на лоб лезлі — яна ж уяўляла складную сушылку, якая змясцілася ў невялікую каробку, з таймерам і з кругамі, і прыкідвала, як на яе бялізну памытую будзе вешаць...

Тады ж за сталом нехта гэта слова забытае — амонімы — і прыгадаў. Навука на далейшае будзе — лепш лішні раз перапытаць, што маецца на ўвазе, а то раптам акажацца, што зусім не тое, што ты падумаў.

**Ілона ВАСІЛЕЎСКАЯ,**
Уздзенскі раён.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 11 461. Індэкс 63850. Зак. № 1785.

Нумар падпісаны ў 19.30 26 жніўня 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12